АЛЬМАНАХ

# ВЫСОКАЕ НЕБА



Творчы конкурс "Дэбют"
1998

Дзяржаўны камітэт па справах моладзі Рэспублікі Беларусь
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Міністэрствакультуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі саюз пісьменнікаў

# ВЫСОКАЕ НЕБА

АЛЬМАНАХ

*Паэзія*

*Проза*

Рэспубліканскі літаратурны конкурс
маладых талентаў
«ДЭБЮТ»

Мінск
1998

Укладальнік А.Масарэнка
Мастак К.Шапашнікава

Высокае неба: Альманах. Паэзія, проза. / Уклад. А.Масарэнка. 1998

У зборніку прадстаўлены лепшыя творы 39-ці ўдзельнікаў Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу маладых талентаў «ДЭБЮТ».

© Укладанне. А. Масарэнка, 1998.
© Афармленне. К. Шапашнікава, 1998.

## Яна АБРАМОВИЧ



### ЕНОТ

Любит музыку енот,
он гуляет в поле нот.
А цветы на этом поле —
то диезы, то бемоли.

*Минск*

## Ольга АДЯЕВА

* * *

Полуденный осенний зной,
пуста туманная дорога...
Один, красивее другого,
слетают листья. Парк пустой
стал молчалив, и в изможденном
поблеклом небе пустота
через туманы и года
рыдает эхом полусонным.
Иду — ни вздоха, ни слезы.
Легко, стремительно, бесшумно.
Вчера в любви была безумна,
сегодня — холодней росы.
Просторный золоченый храм.

Кленовый лист — моя икона,
и от святой тоски бездонной
душа взлетает к небесам.

## КТО-ТО

За темной пеленой ночи
грустит неслышно кто-то.
Он так беспомощно молчит...
Как будто ждет кого-то.

Глядит на свет моих окон
в недоуменье грустном.
Бесшумно выйду на балкон
и трону сумрак — пусто...

Устало тикают часы.
Дымится сигарета.
Чай стынет. Дождик моросит...
Я не дождусь рассвета.

Спущусь во двор. Накинув плащ,
пройду пустой аллеей...
О чем его беззвучный плач?
И чем душа болеет?

Грущу с ним вместе под дождем.
И вместе с ним страдаю.
Но что за боль?.. И кто же он?..
Увы, сама не знаю.

*г. Барановичи,*
*Минская обл.*

## Алена БАБУРЭВІЧ



* * *

На ранні голуб пастукаў у вокны
і сказаў,
што трэба дзякаваць
                        Богу
за лагодны прамень сонца,
за выпадкова знойдзенае зерне,
за магутнасць нястомных крылаў,
за магчымасць лятаць у аблоках...

Я ўдзячная Богу
за тое,
што магу прысвячаць
табе
        вершы.

* * *

Задыхнулася ноч у бяссонні дарог,
павуціннем заслаўшых знямоглую глебу.
Я прыйшла, каб пакласці табе на парог
тое ўсё, чым жыла.
Ці табе гэта трэба?

А на ранні цябе не будзіў тэлефон,
і ты спаў і салодка, і ўтульна.
Твой ахоўвала сон,
а сама — як праклён —
я гуляла з бяссоннем у сумныя гульні.

* * *

Лістапад.
Зоркапад.
Дрэвы адцвілі лістотай.
І наўгад,
неўпапад
дождж перабірае ноты.
І трымціць,
аж звініць,
сцюжа ў спахмурнелым небе.
Пераплыць,
перажыць
адзіноту неяк трэба.
У мяне не засне
злая на душы самота,
ахіне.
Нібы ў сне,
дождж перабірае ноты.

## ГАРАДСКАЯ АКВАРЭЛЬ

Кропляй бэзу расквітнеўся вечар,
разлівае сінь у ручвы гарадоў.
Сонца мне зусім па-чалавечы,
чырванеючы, ківае галавой
і хаваецца за спіны гарадскога
ланцужка шматпавярховых шэрых гор,
пераціснутых пятлёй дарогі,
што чаргу машын ссыпае за бугор.
Падлівае вуліцам настрою
слодыч вечара, іх у палон бярэ.
З небам я палітраю адною
зноў малюю гарадскую акварэль.

## СПАТКАННЕ

### *Аповед*

У мяне было адзінае хвалюючае жаданне — каб хутчэй надышло цудоўнае шматабяцаючае заўтра. Бо заўтра...

Здавалася, ніхто і ніколі ў свеце за тысячагоддзі існавання чалавецтва не адчуваў большага шчасця, чым я, простая, звычайная дзяўчына. І ўсё таму, што Ён прызначыў мне сустрэчу а палове шостай раніцы на спартыўнай пляцоўцы, хаця я ўжо і не спадзявалася ўбачыць Яго пасля стольких месяцаў расстання. Як гэта было рамантычна: сустрэцца, калі толькі пачынае прачынацца дзівосная Аўрора, разганяючы сваімі першымі цёплымі промнямі рэшткі начной прахалоды і трывожнага змроку.

Цэлую ноч не спалася, усё бачылася, як на пустой пляцоўцы набліжаюцца адна да адной дзве адзінокія постаці — я і Ён.

Рэшткі неспакойнага сну зніклі ўмомант, як толькі зашарэла неба на ўсходзе. Мне не сядзелася ў цёмнай кватэры, было душна ў яе шэрых сценах, хацелася дыхнуць свежым ранішнім паветрам, з‘явілася жаданне ўзляцець, распрастаць крылы сваёй душы, свайго пачуцця і шчасця.

Я бегла па пустых вуліцах соннага горада. Толькі дзе-нідзе пачыналі з‘яўляцца са старымі мётламі дворнікі. Я радасна ўсміхалася, увесь свет здаваўся не попельна-шэрым у ранішняй смузе, а светла-ружовым, казачным.

На пляцоўцы Яго яшчэ не было. А я гатова была, як гэта не цяжка, чакаць гадзіны, дні, стагоддзі свайго адзінага, любага, самага-самага. Сэрца шчаслівай птушкаю трымцела ў грудзях, адгукалася хвалюючым рэхам у скронях.

На футбольнае поле выбег кудлаты, брудна-рыжы сабака з апушчаным хвастом і начаплянымі калючымі галоўкамі дзядоўніка. Спыніўся насупраць і нерухома глядзеў сумнымі вачыма. Мне было шкада праганяць яго, нешчаслівага, і я ціха паклікала:

— Дружок!..

Ледзь варухнуўся скалмачаны хвост, і разам з жаданнем падысці бліжэй у карых сабачых вачах мільганулі іскры страху. Сабака не зварухнуўся.

— Эх ты, баязлівец... — шапнула яму і глянула на гадзіннік.

Палова шостай. А Яго ўсё няма!

Першыя промні не паспелі набрацца сілы і цяпла, і зусім яшчэ не грэлі. Было сыравата. Халадок пранікаў пад вопратку, казытаў сваімі калючкамі спіну. Танюсенькія іголачкі перамяшчаліся па ўсім целе. Але які сэнс гэта магло мець?!.

Я чакала Яго.

Кроплі расы скатваліся па гнуткіх травінках на мае ногі, выклікаючы новыя хвалі дрыжыкаў. Сабака падышоў бліжэй і пачаў абнюхваць мяне, дакранаючыся мокрым і халодным носам, саграваючы сваім цёплым дыханнем.

— Дружок!

У адказ — бесперапыннае мільгаценне рыжага хваста. Задумлівыя вочы пазіралі з запытаннем.

— Дружок! — працягнула халодную далонь з азяблымі пальцамі. Сабакаірвануўся з месца і кінуўся лізаць маю руку бледна-ружовым шурпатым языком. Ён лёг каля ног, накрыўшы іх кудлатай поўсцю, спрабуючы цяплом свайго цела сагрэць мяне.

Гадзіннік паказваў без чвэрці шэсць. Холад адступіў і знік ад гарачыні майго пачуцця, але ў грудзях заварушыўся спалох сумнення. Я захавала яго глыбей, каб нішто не трывожыла душу. Я магла не верыць гадзінніку, усяму свету, але толькі не Яму, таму, хто быў для мяне больш, чым свет, адзіным сэнсам жыцця.

Хвіліны ішлі. Я чакала каханага. Як гэта невыносна цяжка, калі хочацца аддаць сваё жыццё да апошняй кроплі і апошняга ўздыху.

На гадзінніку — шэсць. І раптам я адчула, што Ён ніколі не прыйдзе, што ў Яго снах не знаходзіцца мне месца, і Ён кліча начамі не мяне. Ён проста пасмяяўся з майго пачуцця і наіўнасці. Я глянула на сябе збоку, і мне стала

таксама смешна. Я нерухома стаяла яшчэ з паўгадзіны.

Слёз не было. Адно паветра не хапала ў грудзях. Я ціха пабрыла дадому, а за мною, збіваючы кроплі расы вялікімі лапамі, — кудлаты сабака...

Я страціла веру ў чалавека, але знайшла незаменнага сябра, які ішоў побач са мной, памахваючы рыжым хвастом і верна заглядваючы мне ў вочы.

*г. Слуцк,*
*Мінская вобл.*



**Дзіяна БАЛЫКА**

## АБПАЛЕНЫЯ НЕРВЫ

***Чарнобыльскі эцюд***

*Обнаженные нервы земли*
*Неземное страдание знают.*

***Уладзімір ВЫСОЦКІ***

...І загучаў да болю родны, далёкі голас: «Мне цяжка дыхаць, Ладачка...» Я замармытала ў сне: «Бабуля, бабулечка... Не пакідай, прашу, бо я так люблю цябе! Нам трэба пагаварыць пра многае ўпершыню і сур'ёзна».

«Ты чуеш, Ладачка, як дрыжыць, калоціцца маці-зямля?»

«Не. Не чую, не ведаю... Я цяпер у бальніцы, ляжу на сёмым паверсе. З майго акна відаць заводскія трубы ды зубчатыя кварталы новабудоўляў».

«Зямля цяжка варочаецца, стогне, плача. Яна кры-

чыць... Няўжо вы, жывыя, не ведаеце гэтага?»

«Бабуля, родная, ты жывая? Дык не цябе пахавалі на брагінскіх могілках два гады таму?»

Маўчанне...

— Бабуля, дзе ты? — нясмела запытала я, але ў адказ — цішыня.

Пустата агарнула маю душу, і я, уздрыгнуўшы, прачнулася. Страшна... Праз шкло ў дзвярах убачыла, што ў канцы доўгага цеснага калідора самотна мігціць мутная лямпачка. Над горадам уставаў шэры досвітак...

Я інстынктыўна пацягнулася, каб абняць бабулю, але рукі нібы ўдарыліся аб паветра, і я зразумела: яна — на тым свеце, мая бабуля, а я — у гэтым.

«Толькі ніколі нічога не забывай, памятай...»

І я ўспомніла, як у канцы красавіка 1986-га моцна перажывала, калі знікла наша кошка, мая любіміца. А ў маі, калі я сядзела на лаўцы каля дома, нешта брудна-белае, мяўкаючы, шлёпнулася мне на калені.

— Дык гэта Рыжуха! — тут жа здагадалася бабуля.

— Яна ж была вогненна-рыжая, а стала белая? — здзівілася я.

— Ссівела, гаротніца... Адчуваю: здарылася, Ладачка, нешта страшнае, нават жудастнае...

Я ўзяла кошку на рукі, прыціснула да грудзей, удыхаючы знаёмы пах. Ледзь чутна прашаптала:«Прабач, калі ласка...»

«Нічога, нічога, дзяўчынка... Я адчуваю, што неўзабаве памру, бо я ТАМ была, і ў мяне цяпер усё нутро гарыць... Таму, хто быў ТАМ, ужо не выжыць, я ведаю».

Яшчэ нічога не разумеючы, у гэты момант я адчула: стаю на абломках сусвету. Як жа я не заўважыла, калі ён абрынуўся?!. Так, цяпер я ўжо ведаю, што пачалося ўсё страшнае ў тыя  цёплыя дні красавіка, пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС...

У лютым 92-га мяне з Брагіна прывезлі ў гомельскую бальніцу. У палаце нас было чацвёра. Ва ўсіх адзін і той жа дыягназ — лейкоз... Дзвюх дзяўчынак праз колькі часу праглынула смерць. Засталіся Вольга і я. Аднойчы ў

час размовы Вольга раптам змянілася з твару і запытала:

— Ты хочаш жыць, Лада?

Рукі мае ўпалі на калені, а з вачэй выкаціліся дзве салёныя кропелькі.

— Прабач, калі я засмуціла цябе... Толькі, калі ласка, не трэба плакаць, — ціха сказала Вольга. — Я адчуваю, што не сёння — заўтра памру... Як ты лічыш: паміраць страшна?.. Смерць бывае розная — і лёгкая, і цяжкая... Мяне чакае страшная смерць.

— Не кажы так! — Я нават закрычала: — Ты не памрэш, чуеш мяне, Вольга?!. Ніколі!

Уначы мне мірсціліся ў сне працяжна-пакутныя стогны, палахлівыя ўскрыкі. Я хацела прачнуцца, але не змагла. На досвітку, калі ўбачыла побач яшчэ адзін пусты ложак, нешта абарвалася ўва мне. Я ўсё зразумела адразу, аднак не заплакала, не закрычала, і толькі глядзела на чорную трэшчынку ў столі. Трэшчына за ноч, здавалася, стала яшчэ большай. Два разы заходзіў доктар, забягалі медсёстры. Але я нічога не чула і нічога не разумела з таго, што мне гаварылі. У начной цермы я чамусьці пачала дрыжаць, абліваючыся халодным потам, нарэшце ўткнулася тварам у падушку і пачула далёкі голас бабулі: «Ты паплач, лягчэй будзе».

І так захацелася мне, як у маленстве, каб прыйшло дзіва, і сапраўды яно прыйшло — атрымалася, быццам усё гэтае ў маім жыцці адно прыснілася, здалося: і чарнобыльская аварыя, і сівая кошка, і смерць дарагіх мне людзей...

Заўтра будзе мой пятнаццаты дзень нараджэння. А сёння доктар, чамусьці хмуры, сказаў, што мяне выпісваюць з бальніцы. А мама плакала. Прыехалі дадому, у Брагін. Мама сказала, што ў яе сястры нарадзіўся хлопчык, што трэба схадзіць, падтрымаць... Я нічога не разумела: што азначае «падтрымаць», калі дзіця ў сям'і — гэта ж вялікае шчасце! Тым больш, што цётка з мужам так чакалі першынца, і менавіта хлопчыка. І вось — «падтрымаць»... Яму ўжо недзе паўтара месяца, а мне толькі што сказалі...

— Галя, мілая... — абняла маці сястру.

Нечакана і страшна заплакаў у пакоі хлопчык. Галя

ўзяла сына на рукі. Я жахнулася, убачыўшы галаву дзіцяці з амаль адкрытым чэрапам, дзе нешта пульсавала, стукала, жыло... Тут жа выхапілася з дому, прабегла па цёмным двары і за вуглом ледзь не страціла прытомнасць... Не помню, як апынулася ў полі, упала на халодную сырую зямлю і адчула, як яна дрыжыць, крычыць, стогне, плача...

Горкія слёзы пакаціліся па маім твары. І далёкі майскі радыеактыўны дождж заплакаў разам са мною. Я закрычала ў глухую цемру:

— Божа, што робіцца з намі? Куды, у якую бездань мы ляцім?.. Вярніце мне маю чыстую зямлю! Я хачу прабегчы басанож па зялёнай траве, хачу піць ваду са свайго калодзежа, хачу ляжаць на роднай чыстай зямлі і глядзець у яснае добрае неба. Чуеце мяне?.. Хіба ж я так многа хачу?!.

*Мінск*



**Таццяна БАРЫСІК**

***БАЙКІ***

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ ЗЛАЧЫНЦЫ

За гравейнаю дарогай, дзе маленькая крыніца,
на саўгасным полі ўночы крала бульбу маладзіца.
З дзецьмі грэбалася ў глебе. Тыя часу не гублялі —
за якія паўгадзіны, як панесці, накапалі...
Ой ты, долечка ліхая, лёс бядачы — час праклятвы:
баба трапіла ў аблаву, дзеткі — паказалі пяты...
Затрымалі з торбай бульбы. Во няшчасце ды няўчасце!
Страшаць:
— Зараз аддубасім, другі раз не пойдзеш красці.
— Век нічога я не крала, хоць і бедная жанчына...

Пашкадуй мяне, начальнік, бо на тое ёсць прычына.
— Ты мне тут павыскаляйся!.. Гахнем пяць мільёнаў штрафу
і маёмасць канфіскуем!
— Табурэтаў тры ды шафу?..
На заводзе сваіх грошаў я даўно-такі не бачу —
дзвесце тысячаў налічаць, дык іду дамоў і плачу.
Дарагія хлеб і сала... Мае дзеткі хочуць есці...
За такія заработкі — што магу я ім прынесці?!.
— Усё роўна — расхіціцель!.. Ты дзяржаву абакрала!
— Не кажыце гэтак, людцы, я — дзяржаве ўсё аддала:
абясцэніліся грошы на зберкніжцы што ляжалі,
ды яшчэ за чэрвень месяц мне зарплату затрымалі...
І таму, каб з галадухі не адкінуць нам «педалі»,
мы начою гэткім чынам троху бульбы прыкрадаем...
Не крадзем — даўгі вяртаем!

## ХІТРЫ ДЗЕД

Не было ў Амбросі коней, бо ён бедна жыў.
А старэнькі матацыкл большы ўнук разбіў.
І аўтобусы не ходзяць — сцюжная зіма...
Дзед падумаў — і рашыўся: «Сяду на казла!
Мой пяцігадовы Кузька — слаўны, удаленькі,
давязе мяне як-небудзь, я ж — саўсім худзенькі.
На кірмаш жа трэба з'ездзіць, каб купіць карыта,
торбу солі, хлеба, мыла... Эйш, сяльпо закрыта.
Не вязуць нам анічога — не была б глыбінка:
спадзяванні на карову, ды шчэ на падсвінка!..»
Едзе дзедка, шпацыруе. Кузьку паганяе.
Самагонку з пляшкі віннай ціхам папівае...
Раптам перакрылі шлях два міліцыянты:
— Ну?!. Пакажаш сам тавар ці раструсім транты?
— Мне ўжо, дзеткі, семсят сем... І не след чапляцца!
У паганятыя казлоў змусіў я наняцца...
Крама наша на замку, а мне, як ні пніся,
без запалак ды без хлеба — хоць у гроб кладзіся.

— Пашпарт пакажы, стары!.. Гм, Амбросій Сыч?..
Нумар дзе?.. І фары дзе?!. Ах ты, стары хрыч!
— Кузяў нумар — хвост-абрубак, фары — яго рогі...
Ён у цемры бачыць добра, не зламае ногі.
— А чаму ідзе няроўна?
— Кузька мо стаміўся...
— Не пляці ты, дзед, лухты — твой казёл напіўся!
Дзед спужаўся:
— Ой, паночкі... Добрыя вы людзі,
выпейце маёй пякухі — дый на ўсё забудзем.
— Не, дзядуля, мы не п‘ем... Бач, мы — камандзіры!
Дай бутэльку нам з сабой — і на ўсе чатыры...
З меткай, цёмную, бутэльку дзед зпрэзентаваў,
а пачатую за пазуху неўпрыкмет схаваў.
Не такі ўжо ён дурны — загадзя прадбачыў!
Шалапаеў-выпівох з ходу абкалпачыў:
у ягоным першачку — святаяннік з кменам,
а ў памечанай бутэльцы — самагон з пургенам!

І ніхто ўжо тым малойцам не паспачувае —
дармаўшчынка не заўсёды якаснай бывае.

*Магілёў*

## Ольга БОЖЕЙКО

* * *

Утром.
проснувшись только,
сны отряхну рукою,
холодной водою
смою

обрывки ночных кошмаров...
Чаю себе согрею.
И буду смотреть на сугробы
сквозь окно на кухне
замерзшими глазами.

* * *

Домашняя скука
в тесной квартирке.
Ни скрипа, ни стука.
Лишь кошка мяукает тихо.
Часы настойчиво тикают —
им все нипочем.
Бездумно слоняюсь
из одного угла — в другой...
Пройдет полвека
домашней скуки
в пыльном одиночестве...
Вокруг — тишина, ни звука:
часы изъедены ржавчиной,
кошка давно отправилась в мир иной...
А я?..
Что же будет со мной?

*Минск*

## Таццяна БОНДАРАВА

* * *

Спалучае сучаснасць
у бясконцым узоры
нітку светлага шчасця —

з ніткай чорнага гора.
І сплятаюцца ў тайну
пад рукой нетаропкай —
як адказ і пытанне,
як сняжынка і кропля,
яе канец і працяг,
як прысуд і збавенне...

Незваротнасць быцця —
і бясконцасць імгнення.

## СОН

Атрасаючы агністыя пялёсткі,
адцвітаюць на світанку ліхтары.
Горад спіць — самотны, зморaны, стары...
Горад сніць сябе маленечкаю вёскай.

Змрок за вокнамі бяздонны і сляпы,
ліпкі холад распаўзаецца па свеце...
Заграбаючы рукамі шэры пыл,
па сцяне спаўзае долу мёртвы вецер.

* * *

Сонца залацісты дзьмухавец
затрымціць уночы белай поўняй.
Вецер заварочаецца ў сне,
нечакана кветку страсяне —
і пушынкі паляцяць у свет
чарадою зоркава-чароўнай.

*п. Мазалава,*
*Віцебскі р-н.*



## Ярына ДАШЫНА

* * *

*А жыццё — імгненне адно.*
*Як яго мне пражыць?*
*Навучыце мяне любіць,*
*Навучыце любіць...*

***Яўгенія ЯНІШЧЫЦ***

А Вы разумееце, як гэта мала?
Нямая сустрэча, зачынены дзверы,
маўчанне, у кубку астылая кава
і вершык апошні на белай паперы.

А там, за акном, прадчуванне свабоды
і змрок, быццам шалік ахутвае плечы,
і хтосьці ўсё вабіць, і вабіць употай,
пустымі вачыма шукаючы вечнасць.

На золку мой мілы напіцца папросіць,
а побач з ім будзе, напэўна, другая —
чароўная восень, а гэтая восень
ці ж можа кахаць так, як я пакахаю.

Клубочкам ля ног яго, шэранькім ценем
і будучым днём, і кожнай хвілінай,
захоча — агеньчыкам стане у цемры,
маленькім такім, але толькі адзіным.

Над горадам новае сонейка ўстала.
як цяжка было да яго дацягнуцца.
А Вы разумееце, як гэта мала:
пайсці і ніколі ўжо не вярнуцца.
Калі ж не патрэбна каханне яму,
што буду рабіць з ім адна я...

## РАДЗІМА

Кветкай першай, блакітнай вясной —
незнаёмая радасць.
Ты — усмешка матулі маёй
і далоняў шурпатасць.

Па-над соннай ракою агні
і загадкавасць саду,
дахі хат, што буслы будуць сніць
на чужацкіх прысадах.

Ты — як зорка, што з цёмнай начы
прыляцела іскрынкай
і прыціхла ў мяне на плячы
напамінкам-радзімкай.

* * *

Льецца шэпт цішыні праз шчыліны плоту,
толькі конік зялёны раз-пораз цвыркоча,
і раскідвае вецер сухую лістоту,
у сланечнік хаваючы зорачкі-вочы.

І здаюцца страшыдламі голыя ліпы:
у падраных кашулях, стаптаным абутку...
Напалохалі цішу сабачыя ўсхліпы,
пацягнулі, бы костку, у чорную будку.

* * *

Ночкай светлаю, ночкай срэбнаю
я прыйду да цябе — непатрэбная...

Не палохайся, хто здагадаецца,
маладзік за фіранкай схаваецца.

Рукі цёплыя, пальцы тонкія,
валасы твае пахнуць рамонкамі.

* * *

Варажыла восень над Бугам.
Жаўталісце мяла спадніцай...
Журавы развітальным кругам
над самотнай плылі капліцай.

Трапяткая пані-бяроза
каля плоту кагось чакала.
...Проста я ішла па дарозе
і зусім цябе не шукала.

Проста сёння ўначы над рэчкай
месяц зноў за цябе маліўся.

Ты казаў, што не бачыў лепшай...
Можа, ты памыліўся?

* * *

Грукнеш ціхенька ў дзверы —
надзеяй маёй апошняй.
Ноч да агню з даверам
прылашчыцца шэрай кошкай.

Ласкава абдымеш за плечы
і станеш на пальцы хукаць...
І будзем казаць аб нечым,
і будзем мы сэрцы слухаць.

Зацеплім апалак свечкі,
а цемра запаліць зоры.
Датлеюць паціху ў печцы,
на попел сышоўшы, дровы.

І будзе адказ на пытанне
ночы, як кошка, шэрай:
— Гэта наша каханне...
Я, мабыць, табе паверу.

## ЗГАДКІ ДЗЯЦІНСТВА

Сонца — гняздом на бярозе.
Босы, маленькі падпасак
гоніць па пыльнай дарозе
кудлаты авечы статак.

Сцяжынкай між яблынь белых...
Па водару незямному
хусцінка плыве, як вэлюм, —
маці ідзе дадому.

## ЛІХТАР І ЗОРАЧКА

### *Казка аб сапраўдным каханні*

Губляецца ноч у абдымках цемры, і, нікому не патрэбная, блукае па начным горадзе, цалуе выпадковых прахожых, вялізныя дахі дамоў ці даўгія галіны дрэў, робячы іх падобнымі на нейкіх страшыдлаў. Але больш за ўсё ёй падабаецца заглядаць у запаленыя вокны дамоў. Прыпадаючы да шыбіны, яна прасочваецца ў кожную шчылінку і з цікавасцю назірае за людзьмі.

«Дзівакі гэтыя людзі, — думала цемра. Яна ведала кожнае акно ў горадзе. — Вось тут жывуць муж і жонка. Кожны вечар ён (у цёплых каляровых шкарпэтках) сядзіць у глыбокім крэсле і чытае газету, а яна — прасуе яго сарочкі. А ў той вось кватэры дажывае свой век адзінокі стары. Напэўна, пісьменнік». Цемра бачыла, як ён падоўгу сядзіць за сталом і нешта піша, а змрочнае святло яго лямпы гарыць да самага ранку.

Іншы раз цемра наведвала сваіх знаёмых — Ліхтара і Зорачку. Зорачка была яшчэ зусім маладая, пакуль не мела свайго імя — вучоныя не заўважалі яе. А яна не крыўдзілася, бо ў яе быў Ліхтар, яе каханы. Ён стаяў на самым ускрайку горада. Ужо гадоў мо з дваццаць свяціў людзям. Яму не патрэбна была падзяка, бо ў яго была Зорачка.

А цемра здзіўлялася іх каханню, нават у людзей, праз шкло вокнаў, яна не бачыла такой пяшчоты.

На золку, калі ранак размалёўваў чырвонай фарбай тратуары і вуліцы горада, Зорачка і Ліхтар развіталіся. Яны не бачыліся да самага вечара. Але як толькі сонца хавалася ў цёмным бары за горадам, зноўку весела віталі адно аднаго. Ніхто не мог перашкодзіць іх каханню: ні зімовыя сцюжы, якія заляплялі шкло ліхтара снегам, ні шэрыя хмары, што зацягвалі неба, ні халодны вецер, які залятаў у іх горад.

Аднойчы здарылася бяда: чалавек узяў камень і разбіў Ліхтар. Прыцемкам з'явілася Зорачка і не пабачыла роднага святла на зямлі. Яна штовечар чакала свайго каханага, але яго ўсё не было. І пачала Зорачка цьмянець...

Ад яе цудоўнага святла ўжо амаль нічога не засталося. Аднойчы яна не вытрымала і кінулася ўніз, на зямлю... Людзі глядзелі ў неба на маленькую знічку і паспешліва загадвалі свае дробязныя жаданні.

Ніхто не ведаў, што на зямлі не засталося ўжо сапраўднага кахання.

*в. Клейнікі,*
*Брэсцкі р-н.*



**Зміцер ДЗЯТКО**

## ЛАБАНОВІЧ І МЫ...

***(Водгук душы)***

Шчыра скажу: разгарнуў я досыць тоўстую кнігу трылогіі Якуба Коласа без усялякага энтузіязму. «Гэта колькі ж часу, — думаў я, — давядзецца змарнаваць на вывучэнне чарговага твора з досыць *невясёлай* школьнай праграмы». З матэматычнай дакладнасцю падлічыў колькасць вечароў, якія вымушаны буду правесці за чытвом *удаўнелага* ўжо фаліянта, і, паразважаўшы над атрыманай лічбай, зразумеў, што ўсё ж такі мяне смела можна аднесці да безнадзейных песімістаў.

Амаль з горам напалову і з галаўным болем у адзін з вечароў я прымусіў-такі сябе ўзяцца за кнігу. Трэба

заўважыць, увесь дзень перад гэтым у мяне не было настрою, таму палічыў, што нялішне будзе і вечар гэтак жа, з цяжарам на душы, «збайдыкаваць» .

Старонка... Другая... Трэцяя... Паволі заглыбляюся ў тэкст. Неўзабаве пачынаю мала-памалу супакойвацца. Нарэшце і зусім забываю пра ўсялякую драбязу, нейкія там цяжкасці ды турботы. Яшчэ колькі старонак — і я ўжо разам з Лабановічам жыву бадай што адным жыццём... Як у цудоўнай дзіцячай казцы, акурат!

Што сапраўды мяне зачаравала, дык гэта коласаўская мова! Здаецца, падбірае аўтар даволі простыя і без усялякіх выкрутасаў словы, а выдаюць яны настолькі натуральна і пяшчотна, гучаць мілагучна і ласкава, што міжволі пачынаеш радавацца: не абы-хто, а Якуб Колас піша! Уражваюць не столькі пейзаж з яго мясцовым каларытам, колькі тыя сцэны, дзе палешукі сутыкаюцца адно з адным на прасторах жыцця і разыходзяцца па ростанях духоўных стасункаў. Моўная стыхія і паводзіны насельнікаў сапраўды па-народнаму дасціпнага высокамастацкага твора класіка тут наўздзіў псіхалагічна дакладныя. Гэта і дае мне права без сумневу правесці паралель паміж Якубам Коласам і Фёдарам Дастаеўскім. Адразу відаць — блізкія па глыбокім веданні жыцця, два магутныя таленты азораны святлом аднаго і таго ж сонца, і ўзляцелі бадай ці не з гнязда адной і той жа Жар-Птушкі. Мне нават падумалася так: Якуб Колас шмат чаго ўзяў ад светапогляду Ф. Дастаеўскага, і па тым часе гэта лічылася прагрэсіўным.

А калі сур‘ёзней — дык я ўвесь час, пакуль чытаў трылогію «На ростанях», знаходзіў вялікую масу падобных момантаў у жыцці аўтара і яго героя, Лабановіча. Так, Лабановіч — як ёсць сам Колас: і звычкі тыя ж, і тая ж звышчуллівасць да чалавечага гора, і нераўнадушнае стаўленне да свайго роднага кутка. Якуб Колас менавіта як псіхолаг-пісьменнік роўны псіхолагу-пісьменніку Ф. Дастаеўскаму. Зрэшты, не толькі роўны, а блізкі. І калі б Дастаеўскі меў магчымасць — а тым часам і жаданне! — працаваць на ніве сваёй Бацькаўшчыны, ды

яшчэ ў роднай мове, беларуская літаратура наўрад ці замоўчвалася б так, як тое робіцца сёння. Але гэта ўжо іншая тэма...

Прызнацца, найвялікшую асалоду я атрымаў ад неўміручых старонак коласаўскай прозы, дзе пісьменнік апавядае пра Ядвісю. Так напісаць аб крыштальнай чысціні пачуццяў маладых людзей, тагачасных інтэлігентаў-настаўнікаў, мог толькі яўна закаханы чалавек. Канешне ж, такая дзяўчына была ў жыцці Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча, стрэмкай заціяла яму сэрца. З таго ўсё ў вобразе Ядвісі хвалюе і захапляе — як сваёй суладнасцю паводзін з гармоніяй пачуццяў, так і надзіва супакаяльна-трапяткой шчырасцю. Ядвіся — бадай адзіны ў нашай літаратуры мастацкі вобраз, які не мае сабе роўных!

Каханне — каханнем... Без гэтага вялікага пачуцця, вядома, і жыццё — не жыццё. Але, апрача ўсяго, стае ў нашым грамадстве і шмат якіх іншых надзённа-балючых праблем — як у галінах культуры, палітыкі, так і ў сельскай гаспадарцы і вытворча-прамысловым комплексе, станоўча вырашыць якія змогуць толькі такія вось, як Лабановіч, патрыёты, высокасвядомыя нацыянальныя дзеячы, хто заўсёды імкнецца і знаходзіць адзінамагчымую дарогу да праўды.

Здавалася б, мара Лабановіча амаль што здзейснілася, але наша краіна, стаўшы суверэннай, вольнай, неяк раптам рэзка хіснулася з адной крайнасці ў другую... Хаця — калі ў нас рабілася штосьць без памылак? Памыляўся, безумоўна, і колішні вясковы настаўнік-рэвалюцыянер Лабановіч, памыляюцца і яго некаторыя сённяшнія калегі, і менавіта з тых сейбітаў разумнага і вечнага, хто спадзяецца «мірна» суіснаваць між дабром і злом, застаючыся пры гэтым сляпым і глухім у адносінах як да *роднае* мовы, так і да ўсяго іншага, *свайго,* без чаго звацца беларусам бадай што непрыстойна.

*Мінск*

## Алена ІЛЬЮКЕВІЧ



* * *

Маўчыць бяроза,
бо сціх вецер.
Маўчыць варона,
бо не мае голасу.
Маўчыць воўк,
бо ўжо сыты.
Маўчыць крыніца,
бо даўно перасохла.
Але чаму маўчыш ты?..

### ВЯСНОВЫ НАСТРОЙ

Вясна. Лагодны ціхі надвячорак
пяшчотна дакрануўся да зямлі.
Яшчэ імгненне — і не злічыш зорак
на небе, у бязмежнай вышыні.

Прыслухайся, як уздыхае глеба,
чакаючы адказнае пары.
А прыйдзе час — духмяны бохан хлеба
ўрачыста сядзе на абрус стары.

Як плед, паветра ахінае плечы,
вятрыска лашчыць пасмы валасоў.
І думкі разбрыліся па сінечы,
шукаюць выйсця з цёмных тупікоў.

* * *

Гарыць стары, патрэсканы камін,
трашчаць ціхутка стомленыя дровы.
Давай, каханы, трошкі памаўчым,
забудземся, што ёсць на свеце словы.

Ужо і так было сказана шмат
бяздумнага, гаркавага, пустога,
і сэрца, чую, быццам б‘е ў набат
у прадчуваннях нечага благога...

Мы смакавалі горкае віно—
рабілі выгляд, што было салодкім.
Міжволі шчасце нашае сплыло
дымком нядужным, звіліста-маркотным.

* * *

Крык, плач, роспач —
у душы.
Гора, злосць, нянавісць —
без мяжы.
Спагада, ласка, дабрыня —
пад замком.
Слёзы, боль, хлусня —
аж з вяршком.

*Мінск*



## Іна ДЗІЧКОЎСКАЯ

* * *

Сум. На здымкі гляджу я —
пазіраеш з іх ты.
Ні аб чым не шкадую,
не палю і масты.

Не малю аб вяртанні,
п'ю самоту набгом...
Нібы ў вочы каханню,
зазіраю ў альбом.

* * *

Ва ўсім: і дрэнным, і цудоўным,
што адбылося з намі,
ва ўсім: і ў радасным, і ў чорным —
мы вінаваты самі.

Гуляе вецер то ў палях,
то праляціць лясамі...
Які б ні быў, зямны свой шлях
мы выбіраем самі.

*Мінск*

## Аляксей ЗАНКЕВІЧ



* * *

Роднае слова!..
Ты, як першая птушка,
першы гук майго крыку
над зямлёю пранесла.
Дык ляці ж ты
шчаслíва і вольна,
і ніколі, ніколі
не трапляй у сіло!..

*г.п. Капаткевічы,*
*Гомельская вобл.*

## Алена КАВАЛЕНКА

### «РЭКЕЦІРЧЫК»

***Эсе***

Якім шчасцем для мяне было знаёмства з такім, як здавалася раней, загадкавым і наподзіў таямнічым Мінскам. Сямігадовай дзяўчынкай хадзіла я разам з бацькамі па вуліцах і плошчах сталіцы, глядзела на ўсё з непамернай павагай і захапленнем. Мне падабаліся і ціхая спакойная

Свіслач, метро і паркі, магазіны... І нават марожанае, якое можна купіць, мабыць, праз кожныя дзесяць крокаў.

А Камароўскі рынак?!. Я была аслеплена бляскам і яркімі фарбамі найпрыгажэйшых сукняў ды спаднічак, блузак і кофтачак на любы густ, была ашаломленая арыгінальнай будынінай-гмахам з яе аграмадным купалам; міжволі, як зачараваная, слухала зазыванні гандлярак і настойлівыя запрашэнні каўказцаў «хоць што-небудзь купіць».

Я зайздросціла мінчанам, бо яны заўсёды могуць прыйсці на рынак. Так я тады думала, наіўная вясковая дзяўчынка. І не дзіўна, мінчанаў я ўжо любіла толькі за тое, што яны, шчасліўчыкі, жывуць у гэтым цудоўным горадзе...

Спякотны летні дзень. На тэрмометры каля трыццаці. Шматлікія чэргі каля кіёскаў з марожаным ды ларкоў з ліманадам і сокамі. За прыгожымі зручнымі столікамі можна спакойна пасядзець са шклянкай якога сцюдзёнага напою. Тым больш, што пад вялікім пярэстым парасонам не так горача.

Купіўшы марожанае і свежую газету, я села за столік і ўглыбілася ў чытанне. Праз нейкую хвіліну да мяне падышоў хлопчык гадоў шасці-сямі і нясмела, але з годнасцю папрасіў:

— Дайце мне, калі ласка, грошай на бохан хлеба...

Пад уздзеяннем свайго прыўзнятага настрою і павагі да Мінска ды яго шматлікіх жыхароў, я нават не раздумвала доўга — дала роўна сем тысячаў, якраз на бохан хлеба. І толькі потым падумала, што зрабіла ўсё ж нейкую памылку, бо гэты маленькі чалавечык на папрашайку не змахваў: быў ён у джынсавых штоніках, фірменнай майцы і новых красоўках. «Ну што ж, так табе і трэба, — падумала пра сябе з іроніяй. — Эх ты, варона!..» Але, праўда, троху паназіраўшы за гэтым малым «рэкецірчыкам», аж усцешылася: «Не адна я такая».

А хлопчык тым часам упэўнена выбіраў новыя ахвяры. І што — да адной і той жа чаргі ён падыходзіў недзе хвілін праз дваццаць, дзе ўжо былі новыя людзі.

Калі «рэкецірчык» атрымаў з рук вясёлага тоўстага дзядзькі бохан хлеба, я накіравалася следам за малым, ста-

раючыся, каб ён мяне не заўважыў. Недзе за сто метраў быў кіёск саюздруку, і там на лаўцы сядзелі дзве маладыя жанчыны, з густам апранутыя, з гуллівымі ўсмешкамі на тварах.

— Што-о?!. — парыўна выгукнула і паднялася з лаўкі адна з жанчынак, троху маладзейшая за сваю суседку. — Яшчэ адзін разумнік знайшоўся?!. Дзіця пашкадаваў, сэрдабольны.

Хлопчык пачаў нешта гаварыць — апраўдваўся, але яго не слухалі. Другая жанчынка ўзяла бохан і акуратна паклала ў сметніцу, што стаяла ў тарцы лаўкі. Ёй жа хлопчык і грошы аддаў. Яна моўчкі палічыла, і вярнула некалькі паперак:

— Купі сабе чаго-небудзь... Толькі не марожанае, чуеш?!. — І — да суседкі: — Як умалоціць порцый пяць, дык з ангінай цэлы тыдзень носіцца.

— Во!.. Твой крапіўнік больш за цябе зарабляе.

— Ат, не выдумляй... Але добра, што расце. Паслухалася б цябе, дык і сядзела б савою, як ты, адна-адзіная ў пустой хаце...

Мне стала аж неяк нязручна — слухаць балбатню гэтых расфуфыраных малодак не збіралася. Яны мяне зусім не цікавілі. Але я ўпершыню задумалася над тым, што нават і такія мінчане ёсць...

Ад гэтых развагаў сваіх — быццам нешта дарагое страціла. Замаркоцілася. І пасля ўжо, едучы дадому, раптам ухапілася за прамоўленыя адной з «модніц» такія словы: «...сядзела б савою... адна-адзіная ў пустой хаце...», і падумала, што і маленькі «рэкецірчык», і яго маці з вясёлай сяброўкай, магчыма, зусім і не мінчане — прыехалі на «промысел» аднекуль з перыферыі, дзе ўсё яшчэ, на жаль, стае і аферыстаў-парахадзімцаў, і розых там прыстасаванцаў, злодзеяў ды п‘янчуг адпетых...

Падумала так — і мне стала лягчэй на сэрцы. І зноў захацелася ў Мінск, хоць я толькі што пакінула яго.

*в. Лясковічы,*
*Гомельская вобл.*

## Наталля КАРАВАЦКАЯ

### ТРЫ ЖАДАННІ

***(З паўднёвай легенды)***

За вёскаю далёкай, мядовым полем грэчкі
плывуць імкліва хвалі блакітна-светлай рэчкі.
І там, дзе яе бераг арэхамі багаты,
пад сонечнымі промнямі купаюцца дзяўчаты.
З іх кожная — амаль, як росы свежым раннем,
як зоркі ў цёмным небе, што гояць свет каханнем,
як мятны подых ветру, што заблукаў у полі,
як спеў шчаслівай птушкі, што лётае на волі...
А побач, каля рэчкі, сцяжына прабягала —
ад зроку чалавечага яе лаза хавала.
Не бачылі дзяўчаты, як на сцяжыне вузкай
сівы дзядок спыніўся, твар выцер белай хусткай.
Старыя ногі стогнуць, стамлёныя хадою,
гараць ад смагі вусны — хоць бы змачыць вадою...
Старога напаілі вадзіцаю дзяўчаты
і вынеслі паесці яму з суседняй хаты...
— Прасіце, чаго хочаце!.. — дзядок сівы гаворыць.
За дабрыню і ласку дзяўчатам казку дорыць.
Павабны звонкі голас ад шчасця захлынуўся:
— Хачу, каб твару старасці павеў не дакрануўся.
— І мне б адно — каб стан мой гады аберагалі,
балючыя хваробы яго каб не згіналі.
А трэцяя дзяўчына з усмешкаю лагоднай
старога папрасіла, каб быць заўжды пяшчотнай
і ў працы не стамляцца, каб песні, смех звінелі,



і людзі каб пры ёй — душою маладзелі...
Ляцяць гады над вёскай, над полем спелай грэчкі.
Плывуць павольна хвалі блакітна-светлай рэчкі...
І там, дзе яе бераг загушчаны ляшчынай,
стаіць старая хата, а ў хаце той — жанчына.
Здаецца, твар знаёмы — як росы свежым ранкам,
ды толькі стан жаночы скруціўся абаранкам.
Вялікі горб цяжарам прыціснуў моцна плечы,
павеў глыбокай старасці жанчыну пакалечыў.
А там, дзе каля рэчкі сцяжына прабягала,
ад зроку чалавечага лаза жытло хавала, —
гаруе там жанчына з прыгожым станам тонкім...
Была яна калісьці — бы ў цёмным небе зоркі,
і хлопцам рухам ножкі з душы спакой вымала...
Цяпер жа сваім тварам на малпу выдавала.
Дом трэцяй прыгажуні — дыханне ўсяе вёскі:
не заціхаюць песні, не льюцца дзетак слёзкі...
Душу там ласкай слова заўсёды абагрэе,
бо сэрца той жанчыны ніколі не старэе.

*г. Паставы,*
*Віцебская вобл.*

**Вольга КАРАЧ**

## ГУЛЬНІ ДАРОСЛЫХ

***Эцюд***

Ён узяў Яе руку і прытуліў да сэрца. Яна лёгка і амаль непрыкметна дакранулася вуснамі да яго валасоў. Іх шэрыя самотныя вочы, быццам школьнікі па падручніках, старанна шукалі ў процілеглых паглядах адно аднаго...

— Ты кахаў каго-небудзь?.. — ўсяго толькі вуснамі спытала Яна.

— Так, — шапнуў Ён; яго вочы дадалі: «Цябе!»

Яна амаль непрыкметна, пазіраючы кудысьці ўбок, усміхнулася:

— І я — кахаю... Дагэтуль.

Ціха ліла святло жоўтая лямпачка. За вокнамі было холадна, падаў снег, і цесны пакойчык чамусьці здаваўся адзіным месцам, дзе яшчэ заставаліся людзі.

Калісьці даўно Ён кахаў Яе. Зусім па-дзіцячы гадзінамі прастойваў пад Яе вокнамі, і збягаў прэч пры сустрэчы. Ён быў занадта горды, колішні маленькі хлопчык.

Яна не ўяўляла свайго жыцця без Яго, плакала па начах, пісала недарэчныя вершы і чакала, чакала... Але з цягам часу боль прытупіўся, астыў, і потым, калі Яна ўглядалася ў новыя чужыя вочы, ужо не шукала ў іх Яго...

Цяпер жа яны так жадалі паверыць, што менавіта яно вярнулася да іх, тое самае Каханне, якое згубілі аднойчы, прашукалі ўсё жыццё, і нарэшце знайшлі!

— Ты даруй мне... — сказаў Ён. Пры гэтым хацелася ўткнуцца ў Яе плячо і плакаць — горка, безнадзейна, як у далёкім дзяцінстве (яны былі Яму вельмі патрэбныя, гэтыя слёзы, але для чаго — дакладна не ведаў).

Аднак жа слёз не было...

— Ты — таксама даруй... — у Яе голасе быў лёгкі трывожны боль: так баліць паміраючаму дрэву; так адчувае сябе птушка над апустошаным гняздом.

— Мне шкада... — Яго позірк нешта шукаў у Яе вачах: можа, адказ на пытанне, якое ніхто нікому не зможа задаць. — Але ж будзе заўтра... — нібы апраўдваючыся, дадаў Ён.

— Будзе... — згодзіва кіўнула Яна.

Яны верылі — так дзеці вераць у цуд... Але Ён ужо ведаў: пакінуўшы гэты маленькі пакойчык, яму трэба будзе без ахвоты й жарсці цалаваць тлуста напамаджаныя, прыкра-фіялетавыя жончыны вусны...

Яна таксама ведала, што Ёй сёння пазвоніць палю-

боўнік-разжэня, і, як заўсёды, пачне клясьціся ў вечным да Яе, адзінай і непаўторнай, каханні.

Зрэшты, Яна не будзе маўчаць — і ў адказ прызнаецца яму ў тым, чаго і блізка не адчувае...

*Віцебск*



## Вольга КАРЖАНЕЦ

* * *

Ты... Ён... Імпэтны трыпціх ночы...
Халоднай музыкай дрыжыць сутонне.
З ладдзі нябёсаў зорка ўпасці хоча
і растварыцца ў цішыні далоні.
— Чаго шукала ў стомленасці жніўня?
Як ратавалася ў нямую спёку?
— Я спавядалася крышталю ліўня,
і ён змываў маёй віны апёкі.
— Чаму так вецер несуцешна свішча
над снежным храмам вашага кахання?
— То не каханне зараз — папялішча...
Я ўсё спаліла, адагнаўшы здані.
— Сама?
— Сама. Цяпер папрок за шчасце
не патрывожыць у гарэнні болей.
— Ты сніш не срэбнакрылае прычасце?
— ...
— Ты плачаш?
— То расінка... Слёз няма. Даволі...

*г. Слуцк,*
*Мінская вобл.*

## Сяргей КОНАН



# СУСТРЭЧА

## *Аповед*

Ішоў Ён па вуліцы, чыстай, як само жыццё, белай, як зіма. Не звяртаў ні на што ўвагі, адно ўглядаўся ў твары мінакоў.

Ішоў і не знаходзіў патрэбнае — у кожным чалавеку нечага не хапала: то думкі, то святла, то нечага яшчэ. Ён настойліва шукаў суразмоўцу. Душа балела і ныла...

Так, і ў Яго ёсць душа, якая можа балець.

І Ён нарэшце сустрэў чалавека, з якім можна было пагаварыць. Гэтым чалавекам быў я.

— Прабачце... Ці хочаце вы пагаварыць аб тым, што ў вас зараз на душы?

Учора б я пасміхнуўся і пайшоў бы далей, і толькі назаўтра, можа, спалохаўся б. А тут — не стаў адмаўляцца, сказаў:

— Я не супраць... Давайце пагаворым.

Ён спыніўся, паглядзеў на мяне ўважліва і стаў апавядаць:

— Я стаміўся, хаця і не магу стамляцца... У мяне чалавечыя клопаты, але я не чалавек...

— Вы мяне гэтым не здзівілі: у кожнага ў сваім «сёння» можа быць тое, чаго ніколі не было. Я зараз адчуваю зачараванасць, але праз тое не лічу сябе не чалавекам.

Мой суразмоўца пасміхнуўся:

— Але я сапраўды не чалавек... Я ішоў тысячы кіламетраў, не адчуваючы ні стомы, ні адчаю. Шукаў і часам знаходзіў, але знойдзенага было так мала. Зярняты, кінутыя мною, не ўсе ўзышлі. Я думаў, іх будзе суцэльная пра-

стора, але ёсць толькі купіны, бы на якім балоце... Вакол дрыгва, твань — і анідзе чысціні, надзеі на лепшае.

— А якія зярняты былі Вамі пасеяны?

— Зярняты любові, гэтага найпрыгажэйшага пачуцця... Але ім не даюць расці. Яны з'яўляюцца і знікаюць... Іх так мала. І мне ад гэтага стала сумна.

— Я не згодны, што іх мала... У кожнага ў сэрцы хоць адно зернятка любові ды ёсць.

— Кожны мой крок — гэта любоў да ўсіх і ўсяго... Многія мяне ўспрынялі, запісвалі мае словы, ішлі за мною да апошняга. І нават пасля ішлі з маім імем у сэрцы. Але любоў гублялася. Яны верылі мне, стараліся рабіць, як я казаў, ды іх любоў з'ядаў страх. Ён кіраваў імі: не рабі так, не рабі тое, бо пазбаўлены будзеш любові — краіны, дзе ціш і супакой.

— А хіба ёсць такая краіна?.. Мо гэта прыгожая выдумка?

— Што ты зараз адчуваеш?

— Я?.. Ціш і супакой адчуваю, мора любові... Я зараз люблю ўсіх і ўсё.

— Ты б хацеў апынуцца ў нейкай іншай краіне?

— Не.

— Вось бачыш, яна ёсць у табе самім, і не трэба яе шукаць і біцца галавою аб сцяну часу.

Сняжынкі, што падалі павольна, пачалі неяк узвіхрана, мітусліва кружыць вакол нас. Я паглядзеў у Яго вочы і скамянеў, зачараваны: там былі час, прастора і нешта яшчэ, невядомае мне, а можа, і нікому іншаму.

Убачыўшы маю скамянелую ўтрапёнасць, Ён сказаў:

— Так, гэта Я... Ты не памяляешся. Дзякуй, хлопча, за размову. Я шмат гаварыў, ты — слухаў. Цяпер табе ёсць над чым падумаць. — І — пайшоў. Потым павярнуўся, ціха кінуў мне: — Да сустрэчы!

Я пачуў Яго словы, але не злавіў іх — яны бразнуліся долкі перада мною і пакаціліся па заснежанай алеі.

*г. Жодзіна,*
*Мінская вобл.*

## Ольга ЛАВРЕНТЬЕВА

* * *

Я хотела быть листиком,
который оторвали от дерева.
чтобы ветер нес меня куда-нибудь,
чтобы я не замечала ничего,
кроме силы ветра;
а потом я хотела бы просто упасть
в осенний водоем с черной водой,
чтобы кругом был темный лес
на фоне ярких кленов,
а по небу, глубинно-синему,
плыли белые облака,
и была тишина...

Поплакать я смогла бы просто так.
Просто, чтобы лились слезы...
Не из-за чего.

*Минск*

## Марыля ЛАГОДЗІЧ

* * *

Ты чуеш крык?
Гэта крычыць мая душа,
якой у вочы зазірнула маланка.

Ты бачыш святло?
Гэта коціцца поўня
на капішча Перуна.

Ты лічыш леты?
Гэта стрэлка гадзінніка
рушыла на поўнач.

Ты пазнаеш жабку?
Гэта я шукаю
прытулку.

* * *

Гітарныя аблокі
вісяць над нашым пакоем.
Струны іх святла —
павуцінне нашых думак.

* * *

Я паклічу цябе варажыць
над прыпынкамі нашага лёсу,
пацалункамі вусны паліць
пад лагодным паглядам нябёсаў.
Пойдзе следам за намі зіма,
закрычыць тваіх крокаў маўчанне.
І не буду ў адчаі сама
грэць на пальцах
сляпое змярканне...
Я паверу тваёй варажбе —
застануся ў зімовай журбе.

* * *

Ці варта ратаваць сябе ад сну,
калі нам выпадаюць Рай і Пекла,
калі начны нябыт і золак светлы

караюць за дабро і за ману...
Ці варта ратаваць сябе ад сну?

Ці варта марыць пра бялюткі снег,
калі ў душы снуюць брыдот прывіды,
калі баішся звонкага блакіту,
што ахінае твой няшчыры смех...
Ці варта марыць пра бялюткі снег?

Ці варта слухаць сэрца крыгаход,
калі ліецца па стале гарбата,
не свеціцца ў тваім паглядзе заўтра,
і толькі шэрых дзён кругазварот...
Ці варта слухаць сэрца крыгаход?

* * *

Мае слёзы
на вуснах тваіх —
гэта сон твой...
Мае рукі
ў далонях тваіх —
гэта мара мая...
Мае вочы
ў сэрцы тваім —
гэта дзень,
толькі дзень...

*Брэст*



Анна ЛЫГИНА



## ГОЛОДОВКА

***Фельетон***

Один бойкий школьник получил единицу за незнание разницы между катетом и гипотенузой. Почему-то он был уверен, что это одно и то же. Учитель, однако, считал иначе.

Возмущенный столь открытым покушением на плюрализм мнений, бойкий школьник объявил голодовку. Он заявил, что не уйдет со своей последней парты, пока катет не уровняют в правах с гипотенузой, а с полученной им единицы учитель обязан сделать, как минимум, четверку...

Узнав об этом, учитель немедленно объявил встречную голодовку и пообещал, что не покинет свое рабочее место до той минуты, пока бойкий лодырь не признает, что катет и гипотенуза вовсе не братья-близнецы.

Оба они оставались в классе, бросая в лицо друг другу колкие обвинения в виде лозунгов типа: «Долой единомыслие в геометрии!», «Катету и гипотенузе — равные права! (ученик) и «Невежде — нет, ученью — да!», «Руки прочь от гипотенузы!» (учитель).

Вскоре в класс вошла техничка и потребовала освободить помещение для уборки. Противоборствующие стороны не подчинились.

Техничка немедленно объявила голодовку в знак протеста против нарушения внутреннего распорядка, а в коридоре написала на стене: «Которые нарушают распорядок — метлой их со школы!»

А еще через некоторое время объявили голодовку мама ученика, жена учителя и муж уборщицы — кто в знак протеста, кто в знак солидарности.

Напраженность нарастала. К ночи в голодовку включи-

лись жильцы отдельных квартир и одна коммунальная в знак того-сего и чего-то еще. Из принципа. Голодающие активно писали лозунги и призывы, не жалея красок и простыней, внезапно ставших предметами повышенного спроса наряду со школьными тетрадями и письменными принадлежностями.

На следующее утро на работу не вышли жители трех подъездов, что приостановило деятельность одной парикмахерской, одного отдела кадров, одного процедурного кабинета районной поликлиники и одной торговой точки, предлагавшей прохожим пособия по эротическому воспитанию подростков.

Через два дня в голодовку включились ближайшие микрорайоны. На прилавках появились и стали накапливаться продовольственные товары, что вызвало приток в местные магазины массы инорайонных жителей, правда, многие из которых, узнав, что произошло, тут же отказывались от покупок. Участились случаи, когда покупатели возвращали назад мясо, колбасу и сосиски, а один раз — даже говяжью печенку, оказавшуюся на прилавке в связи с подключением к голодовке аппарата райторга.

Появились первые «катеновцы», «гипотенузовцы» и «распорядковцы». Представители каждой из этих групп называли себя так с нескрываемой гордостью.

Через неделю город неузнаваемо изменился. Магазины сияли всеми цветами продовольственной радуги. Отчаявшиеся мясники высовывали головы из-за груд телячьей вырезки, бараньих окороков, ножек и ребер, и с надеждой взирали на входные двери... Девочки из молочного отдела, усевшись за непочатыми кругами еще непереименованного сыра «Советский», измеряли друг другу возрождающиеся талии... Продавцы гастрономических отделов прикладывали прохладные лезвия ножей к синякам и шишкам, набитым на собственных лбах от ударов о батоны твердокопченых колбас, фантастическими гроздьями нависавших над прилавками на каждом шагу... Кооператоры у входа на рынок снизили цены на пирожки и так называемые пирожные, похожие на отрезки старых поленьев. Цена семечек упала с 2-х тысяч до 300 рублей за стопку...

Ученые-медики с восторгом отмечали резкое сокраще-

ние расстройств обмена веществ, болезней печени и желчного пузыря, а также снижение количества камней в почках и в других органах в расчете на душу населения, которое стало приближаться — наконец-то! — к уровню развивающихся стран...

Все столы заказов, как по команде, вывесили объявления о даставке продуктов на дом через 15 минут после подачи заявки. Цена на картошку на рынке падала час от часу от «на 5 тысяч — один» до «на 2 тысячи — шесть». Свежие огурцы, стоившие 10 тысяч за кг, — продавцы, давясь, жевали сами, не в силах снизить цену до тысячи...

Работники ресторанов в ответ на происки нежелающих есть — уставили столики деликатесами и объявили собственную голодовку в знак протеста, поддержки, возмущения, согласия, сопереживания и презрения. А по окончании рабочего дня демонстративно уходили домой с пустыми руками и вывернутыми карманами...

Между тем, основоположник голодовки — бойкий школьник — был насильно транспортирован домой вместе с партой, поскольку вцепился в нее мертвой хваткой. Лишенный возможности болтаться по городу на ослабевших ногах, он внезапно пристрастился к изучению печатной продукции, а поскольку в его доме были только учебники, перелистывая их, вдруг увидел на одной из страниц правило, которое проходили на уроке, который он прогулял. Прочитав правило несколько раз, школьник уловил-таки разницу между катетом и гипотенузой, о чем и сообщил своей маме. Та, в надежде, что ее чадо вернется к приему пищи, взяла его за руку, вытащила из-за парты и приволокла к учителю, который упрямо лежал у классной доски, подложив под начиненную знаниями голову классный журнал... Бойкий школьник, обхватив тонкую шею любимого учителя, прошептал ему на ухо что-то насчет катета. Учитель ответил дряблым прощающим объятием... Стоя у дверей, вытирала слезы радости порозовевшая вдруг уборщица.

Слух о завершении голодовки со скоростью звука облетел город — и уже через сутки с прежней силой зафункционировали многочисленные нужные и ненужные учреждения, заведения, отделы, управления, секторы, отделения, общества...

Столы заказов экстренно срывали объявления об обслуживании на дому. В магазинах мгновенно выстроились очереди, и в считанные часы прилавки обрели ту девственную чистоту, которой они обладали после того, как были сооружены. Товары, не успевшие попасть на прилавки, были оперативно удержаны в подсобках, на базах и складах. Впрочем, от голода никто не умер и умирать не собирался.

Общества и группировки, носившие исчерпывающие названия «катеновцы», «гипотенузовцы» и «распорядковцы», самораспустились. С криком: «Сытое брюхо к ученью глухо!» бойкий школьник носился по микрорайону и его окрестностям, привычно забыв местонахождение учебников и напрочь выбросив из головы разные геометрические выдумки...

На горизонте вновь маячила голодовка. По программе приближалось изучение теоремы Пифагора: квадрат гипотенузы равен...

г. *Жлобин*



## Максім МІКУЛІЧ

* * *

Супакой мяне, дождж, супакой.
І парай, што рабіць мне ў жыцці.
Змый з душы гэты сумны настрой.
І маланкай яе запалі.

Хай гарыць яна яркім агнём.
Ззяе, цепліць усіх навакол.
Хай абпаліць таго, хто з мячом.
Хто нам засціць вялікі прастор.

*г. Асіповічы*

Вікторыя МІСЮЧЭНКА



*Два апавяданні*

## РЭКС І ТУЗ

Калі-нікалі чалавеку здаецца, што настаў канец свету. Вось і ў Алеся было такое пачуццё. Ён сядзеў за сталом, падпёршы падбародак рукамі, і засяроджана думаў...

Добра помніўся летні дзень, калі, гуляючы з сябрамі на панадворку, ён убачыў ля плоту шчанюка. Той ляжаў, скруціўшыся ў клубок, і час ад часу жалобна паскульваў, нібы прасіў: «Узяў бы мяне каторы з вас, пакарміў, абагрэў, і я стаў бы служыць яму да самай смерці... Ну, хлопцы, ратуйце мяне!»

Гэта быў звычайны дварняк каштанавага колеру з чорнымі плямкамі, і вушамі, як у аўчаркі. Алеся вельмі ўразілі чорныя, як два гузікі, сабачыя вочы. Яны былі зусім незвычайныя, і, здавалася, што ў гэтых вачах сабралася ўсё добрае, што ёсць на свеце. Шчанюк глядзеў Алесю бадай што ў душу і нясмела віляў сваім маленькім хвосцікам. У яго чорных «гузіках» нешта адбывалася: з'явілася надзея-давер і разам з тым журботная ўсмешка, і Алесь ледзь не заплакаў ад жалю — нахіліўся, узяў шчанюка на рукі, тут жа і ўбачыў, што правая пярэдняя лапка крывавіла... Слаўка — надзейны Алесеў сябар — прапанаваў паказаць шчанюка ветэрынару, які жыў у суседнім доме. Ветэрынар агледзеў знайдзёнка і сказаў, што лапку яму зламалі — ці хто наступіў ботам, ці, можа, пад машыну трапіў... Наклаўшы на лапку гіпсавую павязку, ветэрынар сказаў, каб паказалі яму шчанюка праз тыдзень.

Алесю даўно хацелася мець сабаку, але ў кватэры не было месца: дзіва што — аднапакаёўка. Выручыў Слаўка — ён даў прытулак шчанюку, якога назвалі Рэксам. Пасля ветэрынар зняў гіпсвую павязку, і Рэкс ужо мог так-сяк, кульгаючы, перасоўвацца. Неўзабаве ён і зусім ужо не кульгаў...

І вось — Алесь з бацькамі прыехалі ў прынёманскую вёску адпачываць. Вядома ж, Алесь узяў з сабою Рэкса і свой веласіпед. Тут хлопчык з сабакам пасябравалі так, што ўжо і не расставаліся; нават спалі ў адным ложку, і ў сне Рэкс часта гаўкаў, прыглушана, не разяўляючы пашчу. А днём, куды б Алесь не ехаў, і Рэкс заўсёды бег следам, не адставаў, але і наперад не лез. Да таго ж — ён вымахаў даволі вялікі, знешне быў троху падобны на аўчарку...

Падчас іх апошняй прагулкі Рэкс нечага раптам запабег наперад, спыніўся і ціха ўзвыў... Падалося, што натаміў параненую лапу, хоча адпачыць. Алесь стаў разварочвацца — крута ўзяў улева і, выехаўшы на сярэдзіну дарогі, нечакана для сябе ўбачыў грузавую машыну, што выхапілася з-за паварота... Ён разгубіўся і не ведаў, што рабіць. Першы зрэагаваў Рэкс — кінуўся да Алеся, падскочыў, і з такой сілай папіхнуў яго ў спіну, што той разам з веласіпедам апынуўся ажно на ўзбочыне. Але сам ён, Рэкс, не паспеў ухіліцца, трапіў пад грузавік і загінуў...

Стукнулі дзверы — маці вярнулася з ракі. Паказала сыну бацькаў улоў, ды Алесь нават і не глянуў на рыбу.

— Ну што ты апусціў галаву?.. — Маці падышла да Алеся. — Рэкса ніяк не можаш забыць?.. Не ўбівайся, не тузай сябе... Мы з бацькам так вырашылі: купім табе сабаку, кропля ў кроплю падобнага да Рэкса, і будзе ён жыць з намі ў кватэры... Як-небудзь паладзім. Ну, ты рады?

Алесь не разумеў маці: падобнага да Рэкса сабакі нідзе няма... Няма і ніколі не будзе!

Праз колькі дзён у вёску прыехала на ўласнай ма-

шыне некалішняя дырэктар школы, цяпер — глыбокая пенсіянерка, але ўсё яшчэ па-маладому хвацкая. Маці сказала, каб Алесь зваў яе цёткай Шурай. Алесь адразу звярнуў увагу на цётчынага сабачку, светла-рыжага спаніэля па клічцы Туз. Можна сказаць, ён у першы ж дзень пасябраваў не толькі з цёткай Шурай, але і з яе Тузам, няўрымсна-рухаввм, вясёлым. Трэба ж, у Туза былі акурат такія ж, як і ў Рэкса, вочы: два чорныя «гузікі», поўныя дабрыні і ласкі... І што — ужо на другі дзень Туз ні на крок не адставаў ад Алеся: мусіць, адчуваў хлопцава гора і стараўся развеяць яго...

Алесь пачаў прыглядацца — і заўважыў: Тузу падабалася ўсё тое ж, што і Рэксу. Асабліва да спадобы прыйшлася сонечная палянка на ўскрайку лесу, поўная кветак і суніцаў. Так, ён таксама, Туз, любіў, лежачы ў траве, сачыць за тоўстымі махнатымі чмялямі, якіх даволі шмат лётала вокала, таксама гатовы быў цэлы дзень плёскацца ў рацэ, а яшчэ — з ахвотай ганяў па лужку мяч...

Цётка Шура, пэўна ж, была не толькі добрай настаўніцай, але і неблагім псіхолагам. Ад‘язджаючы ў Мінск, яна паклікала Алеся і, аддаючы яму ланцужок з ашыйнікам, усцешана сказала:

— Тузу майму, як я зразумела, з табою лепей, чым са мной... Вы пасябравалі, і я не хачу вас разлучаць — сябруйце і надалей...

Алесь быў на сёмым небе ад шчасця. Ды раптам ён спахмурнеў: «А ці не здрадзіў я?.. Рэкс выратаваў мяне, і я павінен любіць увесь час толькі яго аднаго... — Але потым, успомніўшы добрыя вочы Рэкса, рашуча адагнаў ад сябе самотную думку. — Не здрадзіў!.. Рэкс радаваўся б, што я знайшоў сабе добрага і надзейнага сябра».

## СЯБАР РАЗУМЕЕ БЕЗ СЛОЎ...

Гойсаў Ветрык у полі, гайдаў кветкі, падпяваў птушкам ды стракозам, а паблізу гуляла маленькая дзяў-



чынка. Яна таксама напявала нейкую песеньку, збірала кветкі і пляла з іх прыгожую «стужачку». Потым злучыла кончыкі — атрымаўся вабны вяночак, і яна надзела яго сабе на галаву. Ветрык падляцеў бліжэй і спытаў:

— Скажы, дзяўчынка, навошта табе гэты вяночак?..

Ды словы яго прагучалі, бы нейкае выццё, і дзяўчынка спалохалася — пабегла дахаты. Ветрык пакрыўдзіўся і ўжо не мог заставацца ў полі — паспяшаўся ў лес. Гуляючы там, заўважыў маленькую хаціну. Яму стала цікава, не ўтрымаўся і загукаў:

—Гэй!.. Хто ў доміку жыве?.. Я хачу пасябраваць з табою — выходзь.

Зноў яго словы падаліся выццём. Тут жа выхапіўся з леснічоўкі, бы ўчадзелы, з дубальтоўкаю ў руках раз'юшаны ляснік, стрэліў у бок Ветрыка, нібы гэта быў воўк. Спалохаўся Ветрык. І ўжо не проста пакрыўдзіўся, а як мае быць узлаваўся. Каб і блізка з людзьмі не сустракацца, паляцеў да возера. Аднак і там напаткаў людзей — двое рыбакоў сядзелі з вудамі на беразе і ціхенька аб нечым размаўлялі. Ён адно павітаўся, як тыя пачалі клясьці яго, потым пабралі вуды і падаліся ў вёску.

Ветрык, разгублены, самотны, сеў на ўспесак і пачаў разважаць: «Я нікому не патрэбны... Ніхто са мной не хоча гаварыць... Лепей, каб мяне зусім не было на свеце». І сядзеў бы ён так доўга, ды пачуў, што нехта кліча яго на возеры:

—Ветрык, дзе ты?!. Чаму цябе няма?.. Мая лодка не можа плыць, дапамажы!

Ветрык падскочыў, глянуў на возера і ўбачыў парусную лодку, а ў ёй — хлопчыка. «Ага!.. Значыць, я патрэбны гэтаму хлопчыку!» — здаўмеўся ён і паляцеў на дапамогу. Убачыўшы яго, хлопчык папрасіў:

— Ветрык, падгані, калі ласка, маю лодку да берага.

— Добра, хлопчык... Падганю.

Яго словы зноў прагучалі, бы выццё, але хлопчык

не спалохаўся. Можа, што вельмі хацеў іх зразумець, проста адчуў сэрцам, бо дзеці заўсёды найбольш чулыя, чым дарослыя.

Ветрык падагнаў лодку да берага і сказаў:

— Хлопчык, давай сустрэнемся і заўтра тут, на гэтым месцы.

— Давай! — узрадаваўся той.

Ветрыку таксама стала радасна, і ён заскакаў так, што старыя дубы ажно закалыхаліся.

*Мінск*

## Наталья **МИХАЛЬЧУК**

* * *

Не вздохнуть и не забыться —
ночи день черней.
В душной я жила темнице
ревности своей.

Мои выплаканы слезы,
Ваши — впереди.
Безнадежной я занозой
буду Вам в груди.

И поймете, мой любезный,
что всего страшней —
жить в наручниках железных
совести своей.

*Могилев*

## Ірына ПОЎХ

* * *

Сэрца б‘ецца ў абдымках жыццёвых,
ад якіх не схавацца, не збегчы.
У мігценні хвілін каляровых
штось гадзіннік мне стрэлкамі шэпча.

Вецер кружыць з самотным адчаем
стрэлак, лічбаў пажоўклае лісце.
А гадзіннік назад адбірае
ўсё, што мне ён пазычыў калісьці.

Ліхтароў звар‘яцелыя вочы,
зрок згубіўшы ў цямноце нябыту,
знервавана, напружана сочаць
за душою — люстэркам разбітым.

* * *

Круціцца, круціцца ў коле вавёрка.
Вось прыйдзе вечар, і скончыцца дзень.
У небе ліхтар павітаецца з зоркай,
і са сцяжынкай сустрэнецца цень.

Круціцца, круціцца ў коле вавёрка.
Сёння і заўтра. Праз тыдзень і год.
Горка і крыўдна, крыўдна і горка.
Круціцца кола — турбот карагод.

* * *

Рассыпаў люты смех ільдзінак
на зачарованым акне.
У дзень Святога Валянціна
Вы раскажыце казку мне.

Трапеча сэрца белай птушкай.
Праб‘е гадзіннік. У той час
я стану ў казцы Папялушкай,
і каралеўнаю — для Вас.

О, дзіва-казка! На хвілінку
пачуйце сэрцаў нашых стук.
Кахання кветку, «валянцінку»,
прыму я толькі з Вашых рук.

У дзень Святога Валянціна
згадайце наш пяшчотны вальс
і з таямнічасці ільдзінак
складзіце: «Я кахаю Вас!»

* * *

Ноч апаліла
чорным маўчаннем.
Сэрца застыла
ў марным чаканні.

Думка імчыцца —
сэрца імкнецца
ў часе згубіцца,
марай сагрэцца.

Зорка знікае —
у вечнасці гасне...
Сэрца ў адчаі
згіне дачасна.

* * *

Я выдумала Вас,
я ведаю дакладна.
Сказаў пра гэта час,
што мне не падуладны,
шапнуў халодны дождж,
што вас я не пазнала,
а выдумала... Што ж,
напэўна, я кахала
не Вас, мой прынц, о не! —
сваю прыдумку-казку.
Згадайце пра мяне,
але — зрабіце ласку! —
не сёння, не вясной.
Як сэрца штосьці пачуе,
хай восеньскі спакой
партрэт мой намалюе
лістотай на акне...
Растане сон паволі.
Ноч скажа, што мяне
тут не было. Ніколі.

*п. Ленінскі,*
*Жабінкаўскі р-н*

## Сяргей **ПРЫЛУЦКІ**



* * *

Імя Тваё —
як далёкі край...
Усё ў ім таемна
і не зразумела.

## ЯНО

Бачыў: аблокі белага стронцыю
доўгімі пульхнымі пальцамі
зрывалі і паглыналі
сакавітыя травы...
Цыркалі слінай у азёры...

Поўзалі птушкі на пузах —
сляпымі вачыма шукалі,
намацвалі крыллем апалым
месца для смерці...
З вар'яцкім туманам у вачах
лёталі белыя коні
па-над закінутай стайняй...

Спадалі зялёныя космы
з самотных дрэваў...
НЕШТА пранікла ў мяне
і станавілася мною.

Я станавіўся НІЧЫМ.

* * *

Калі ўжо ты хочаш —
я знікну сёння ж,
растваруся ў брудных хвалях,
адарвуся
лістком пажоўклым...
Адлегласць між намі ў Слова.
Я — скажу,
ты — адыдзеш назад.
...мнуцца травы,
дымяцца дарогі...
Калі ўжо ты хочаш,
не вярнуся я.

## НЕЗВАРОТНАЕ

### *1. РОСПАЧ*

*

Расплаўлены смагаю крык...
З-пад стрэх саламяных — крык...
Распалены соллю крык...
З-пад сініх нябёсаў — крык...

Самлелы ўздых...
Сціх...

*

Абпаленай кветкі пялёсткі...
Раскрышаных дрэваў лісцё...
Вісяць на крывых пагорках
рэк непрытомных істужкі.

*

Дыміцца сухі небакрай —
смугой засцілае вочы...
Спёка...
Спустошаны край...
Вінавата маўчаць дарогі...

*

Кожны крок — вяртанне...
Кожны крок — з небыцця —
у невыносныя хвілі трывання.

*

Пярэдадзень.
Заўтра — канец
задумлівага падарожжа.

Адпачнуць нарэшце ногі
ля бацькоўскага ганку.

## *2. СОН*

*

Спалохалася цішыня —
дзікі грукат...
Раскацісты свіст...

*

Ціхі шэпт, ціхі.
незразумелы...
Горкім дымам і цемраю вее...
Храбусціць
пад нагамі
маладая рунь...

## *3. РОДНАЕ*

*

На двары — чужыя сляды... Цяжкія сляды...
На кожным.
на кожным двары — сляды! сляды! сляды!..
Згвалтаваныя сляды...
У бяздонных вачах — сляды...
На матулі — сляды...

Больш не вернецца маці...
Куды ты?!. Куды?!. Куды?!.
У бацькі на целе — сляды...
Не вернецца бацька...
Тата!.. Такі малады!..
— Куды ты ад нас?
— У нікуды.
Назаўжды.

*

...малое дзіця ляжыць,
абпаленым целам дрыжыць...
Блакітным вокам трымціць —
напалохаў
прышэлец у вялізных ботах.

## *4. ТАМ*

*

Крыж малы...
Крыж вялікі...
Звісае журботна
рушнік даматканы —
на памяць...

Наводдаль — курган старажытны...

*

Пліты — разбітыя...
Магілы — разрытыя...
Прах лёгкай смугою
спадае паволі,
забыта
на вочы і сэрцы забітых.

### *5. ЗНАК*

*

Бруіцца праменне
з гарачага жоўтага неба...

Працятае дротам Сонца...

*

За дзвярыма зліліся сілуэты...
Трымціць на галіне сухой
валосся залацістага жменя...
Выплёўваюць ільністыя трубы
мільёны,
мільёны
зламаных...
Куродым... Падземныя стогны...
Перакрэсленыя дарогі...
Назаўжды.
Назаўжды.

### *6. НЕЗВАРОТНАЕ*

*

Здарылася —
аблокі
апалі на нашы далоні...
Бездапаможна сцякалі
скрозь пальцы худыя,
знікалі
ў бурлівай плыні хаосу...
Глядзелі ў роспачы мы неадрыўна
на іх павольную смерць...
Аблокі!.. Аблокі!..

Сцякалі,
ліліся
праз нашыя душы,
праз нашыя сэрцы плылі.

*Брэст*

## Наталля РАДКЕВІЧ



## ПАРОГ

***Навела***

Натка ўхапіла венік і пачала месці падлогу. Бабуля ўгледзела непарадак — заўважыла:

— Ад парогу хату не мятуць.

— А чаму?.. — здзівілася ўнучка.

— Парог — святое месца... Пад парогам збіраюцца душы продкаў, якія раней жылі ў гэтай хаце. І трэба так усё рабіць, каб іх душы не мелі злосці на цябе.

— Бабуля, дык і тое, што мы садзімся на колькі хвілінак перад тым, як паехаць куды, мае таксама сваё значэнне?

— Зусім так, Наталачка... Гэты звычай нельга забываць. Калі хто з сямейнікаў адпраўляецца ў далёкую дарогу, усе абавязкова мусяць сесці і моўчкі звяртацца ў думках да ўсё тых жа продкаў, каб дапамагалі падарожніку і каб за час яго адсутнасці нічога не здарылася ні з яго роднымі, ні з хатай.

— Бабуля, ты столькі цікавага ведаеш, раскажы яшчэ што-небудзь.

— Адчапіся ты, малое, усё табе раскажы ды раскажы, а працаваць калі?

Баба Ганна выйшла з хаты і нечага раптам знерухомела — непаварушна стаіць пасярод двара і маўчыць...

Аж гэта ёй прыгадалася маладосць — унучка, пэўна ж, разварушыла-раскатурхала ўсівелую жанчыну. Як цяпер помніць Ганна тую восень, калі бралася шлюбам з Васілём. Ад‘язджаючы з роднай хаты, развітвалася з кожным куточкам, кланялася і плакала... А як яны, маладыя, у царкве стараліся не наступіць на парог... Або той, самы трапяткі момант, калі Васіль нёс яе на руках у хату сваіх бацькоў. Чаму на руках? Ды баяліся ўгнявіць душы продкаў, хацелі, каб у новым доме маладой было добра, каб яна стала сваёй!

І да гэтага часу не забыла Ганна, як яна, маладая маці, купала сваіх дзетак на парозе: налівала ваду ў вялікія ночвы і па чарзе мыла спачатку дзяўчатак, а потым ужо і свайго адзінага хлопчыка. Колькі гадоў мінула з таго часу — дзеці даўно павырасталі, у Ганны ўнукі ўжо ёсць, аднак жа нічога не забываецца, нібы тое было зусім нядаўна...

Ганна зірнула на плот, дзе віселі посцілкі, вытканыя яе рукамі ў доўгія зімовыя вечары. Так, гэта ж яна змятала ў далонь пыл з парога, каб пасыпаць ім аснову для гэтых посцілак... Як тое ўсё даўно было і — нядаўна!

А яшчэ яна прыгадала, як варажыла на свайго Васіля — хацела даведацца, ці ён яе кахае або якой іншай дзяўчынай трызніць... Узяла дубчык з новага веніка, пайшла ў хату да Васіля, нібы па нейкай пільнай справе, неўпрыкмет паклала ля парога дубчык і стала чакаць, калі ж Васіль выйдзе з хаты — пераступіць праз яе дубчык. І дачакалася... А ўвечары пайшла ў лазню і шаптала там нейкія словы... Во якая была дзівачка!

Ганна спахапілася: што ж яна так стаіць?.. Ухапіла вядро і пайшла па ваду — студня, дзякуй Богу, паблізу, бадай насупраць. Вярнулася, толькі зайшла ў хату, а тут нячыстая сіла суседа нясе, стукаецца:

— Ці можна да цябе, Ганна?.. Добры дзень!

— Добры дзень, Міхась.

Сусед неяк няўдала ступіўшы, зачапіўся мысі-

кам бота за парог. Ледзь быў не ўпаў.

— Што гэта сёння са мной?.. — сказаў ён здзіўлена. — Да каго ні зайду — і ўсюды чапляюся за парог, боты паабіваў.

— Патрэба ў цябе нейкая ёсць, і ты спяшаешся... — сказала Ганна, а сама падумала, што заўтра сусед яшчэ раз наведаецца да яе.

Міхась прыйшоў пазычыць мяшкоў, збіраўся ехаць на млын. Ганна адмовіла, бо мяшкі былі занятыя, але паабяцала перасыпаць зерне ў скрыню, выслабаніць мяшкі, і Міхась на гэта ўзбурана сказаў:

— Во-во, і ўсе іншыя мне гэтак раілі: заўтра прыходзь, а сёння не дуры галавы...

— Таму і спатыкаешся, суседзе, бо гэты свой паход давядзецца зноў паўтарыць... Парог не падманіш, — пасміхнулася Ганна, а тым часам падумала: «Во! Парог цэлы дзень быту не дае, прыгадваецца... Хм, унучка ўсё ўва мне разварушыла. Да чаго б гэта?..»

*Мінск*



## Юрый РАДНОЎ

* * *

На дзівосных і вольных мясцінах
featured
рознаколерны вытканы луг.
Што ён тоіць у кветках — быліны
ці нашчадкаў узвышаны дух?

Кветкі з ветрыкам песні спяваюць.
Я іх чую зблізу і здалёк.

А травінкі, бы скрыпачкі, граюць,
і танцуе для ўсіх матылёк.

Песні гэтыя льюцца спрадвеку,
напаўняючы змест дабрынёй.
Яны лечаць душу чалавека
верай, праўдай, любоўю сваёй.

На дзівосных і вольных мясцінах
так і хочацца сэрцу спачыць.
І паслухаць ад кветак быліны
пра мой край беларускі, адзіны,
які я не стамлюся любіць.

* * *

Мелодыю ветра
запісвае дождж,
а я яе, сумную,
сэрцам чытаю.
О, горкая восень,
мяне не трывож
хусцінкаю выцвілай
вольнага краю.
І сэрца згадзіцца
павінна б усё ж
жыць у чаканні
чароўнага маю...
Спявае самотную
песеньку дождж,
якую на верш я
пераствараю.

*Мінск*

## Алена РЭПЧЫК

### ІГОЛКА

#### *(Вершаказ)*

На свеце ёсць іголка, якой шыюць і вышываюць. Яна — стваральніца прыгажосці.

Іголка кактуса — маленькае кап‘ё, дакранаючыся да якога, адчуваеш: прыгажосць умее-такі абараняцца!

*г.п. Капаткевічы,*
*Гомельская вобл.*

## Алеся СЕРАДА



*Што для мяне мае вершы? Проста сляды, што пакідаю на пяску, ідучы наперад. Куды? Як дайду, раскажу. Я ж і сама не ведаю, што для мяне мае вершы.*

*Можа, вам будзе цікава прайсціся па маіх слядах. Мой зблытаны шлях дзе толькі не віўся, бо кожны новы дзень мной кіравала новая зорка — зорак тут хопіць на ўсіх. Прыходзьце і вы паглядзець, можа, і вам будзе цікава прайсціся па маіх слядах.*

*Што для мяне мае зоркі? Сляды, што пакінуў нехта на небе, кабісці наперад, да сонца. А сонца? Ці ж ведаю я? Як дайду, раскажу, а пакуль... Мне б толькі даведацца: што для мяне мае зоркі?*

## ПА-НАД ШАШОЙ

У прыцемкі ўвесь свет звівае крыл узмах,
адно шаша сшарэлая свой долу крывіць шлях.
Па-над шашой усё імкнецца
вятрыска ўдалы й непарушны,
кудысь сівы кульгавы месяц
па-над шашой шурпатай рушыць,
і хмар паўзмрок калматавокі
прыжмурыў прагныя павекі.
— А ці далёка?
— Ды не вельмі!

У прыцемках так лёгка адшукаць стравелы шлях.
Так лёгка шэрую траву пагушкаць на руках.
Па-над шашой трава без кветак
і кветкі без сцябла і ценю
чакаюць заканчэння свету,
нябёс кранаючы адценні,
і, дачакаўшыся паўзмроку,
упарта шэпчуць з крутагор‘я:
— А ці далёка?
— Ды ўжо скора!

У прыцемках усцішана знікае мройны морак,
у прыцемках цяплее час і лёс хавае зброю.
Па-над шашой кудлаты явар
шукае ў шуме заканчэнне,
ператварае твары ў яву
і адпускае апалчэнні.

І толькі загуляка-лёкай
якраз вяртаецца з народзін:
— А ці далёка?
— Зараз дойдзем!

У прыцемках бязважкіх удваіх паволі крочым
мы па шашы, і мы маўчым, нам не паспець да ночы.
Па-над шашой туманам крохкім
паветра іклы зроку рэжуць
і ставяць вадкія шматкроп‘і
нам невядомага бязмежжа.
А колькі нам адмераць крокаў
ад апраметнай да аблокаў?
— Ці хутка мы?
— Яшчэ далёка!

## РУЖА

Ружа цяжкім бутонам
узнялася над голлем,
праз бутон аднатонны
палымнела вуголлем.
І аднойчы, пад росны
светлы травеньскі ранак
разарвала лістоту,
усчырвонела ранай.
Пунсавеюць пялёсткі,
як крывавае сэрца,
і салодкі-салодкі
водар хмельны ліецца.
Ружа свечкай палае
над зялёнай лістотай,
бы чагосьці чакае,
уздыхаючы ўпотай.

## МІНСКІ ВЕЧАР

Калі Мінск паўночны ледзь-ледзь абудзіўся паўсонны,
калі Мінск паўдзённы пад зоркаю першай заснуў,
скрозь хмары натоўпаў і шум гарадскі манатонны
я ў чыстае вока бясконцага неба гляджу.
І чуецца мне, як напружана дыхае горад,
агністыя вуліц патокі скрозь цемру ляцяць.
Б'юць гмахі, як крылы, у бездань нябёс непакорна.
І ў велічы іх я — нязначная знічка жыцця.
А час, нібы птах, узнімаецца ў вечнае неба
і па-над самотнай ракою лунае, трымціць.
І Свіслач маркотна ліе сваё бруднае срэбра,
і плынь адлюстроўвае цені спатканняў чужых.
Надзеі і мары блукаюць у стомленым суме,
і плёскат вады нібы плач, нібы смех, нібы стогн.
Няяўныя мроі зліваюцца з горадам гулам,
і падае, падае песня празрыстым лістком.
Ты — Мінск. Ты адзіны. Шматлікі, шматмерны, шматтвары.
Ты цмокам узняўся, у цьмяны схаваўшыся дым,
і, схоплены дзікай тваёй прыгажосцю пачварнай,
усе мы — імгненні — у цыкле бясконцым тваім.
Ці я твой палоннік, ці твой пажыццёвы паломнік —
але ў гэты час паяднаў мяне з часам твой рытм,
калі Мінск паўдзённы ў агністай паўзмрочнасці тоне,
калі Мінск паўночны паўсоннаю зоркай гарыць.

## АСЕННЯЕ ЛЮСТРА

Недапаленыя напалмам
наліпаючых вірусаў восені,
вашы вочы глядзяцца аквварыумамі
з патрэсканым шклом.

О лупатыя ласыя люстры.
Прусакі казыталі вас вусамі,

цалавалі антэнамі хрусткімі,
каб спаткацца з патрэсканым шклом.

Гэта з вашае волі высочваюць
вашы вочы з-пад пыльнага прысаку
мае ўласныя цьмяныя вочы
з затравелым патрэсканым шклом.

## СКАРБНІК

Скарбнік брыдзе дарогаю ў полі,
скардзіцца ветру на горкую долю:
вечна галодны, у рвані нягожай,
скарбаў сваіх ён патраціць не можа.
Гнуць да зямлі залатыя аковы,
куфар ламае спіну стопудовы.
Злосны, пануры і пылам пакрыты,
скарбнік брыдзе па дарозе разбітай.
Ведае: скарб той не працай здабыты,
потам людскім і крывёю абмыты.
Цяжкім праклёнам пазбаўлены волі,
скарбнік не збавіцца скарбу ніколі.

## МУЗЫКА

*Тому Ёржу*

На небе музыкі
выпускаюць з ланцугоў
вар‘яцкую душу.
Пад небам музыкі
запускаюць у ланцугі
ідэальнае цела.
Над небам
музыкаў няма.
    На небе чакаюць.
    Пад небам
    я таксама некаму патрэбна.

Над небам
музыкаў няма.
На небе ёсць зоркі,
што цягнуць за сабой
каметныя хвасты.
Пад небам ёсць душы,
што гоняць ад сябе
апошняе змярканне.
Над небам
музыкаў няма.

## МАТЫЛІНАЯ МАЦІ

Хтосьці дзяцей нараджае.
Хтосьці ім зброю куе,
мне ж без патрэбы на джала
іншая доля прыпала:
пасвіць у небе стажарым
мятлушак — дзеткі мае.
«Воблака — ці яно птушка?» —
шэпчуць і шэпчуць без слоў
мятлушак шустрыя душы.
Што ж я, падманваць іх мушу?
«Воблака — ці ж яно птушка,
каб цікаваць матылёў?
Воблаку — падаць пяшчотна
пасмай на ўзлоб‘е нябёс,
падаць па сонечнай жоўці
шчэццю, паркалем ці шоўкам,
бы матылёчак пяшчотны,
быццам бязлітасны лёс».
«Сонейка — ці яно птушка? —
крылцы імклівых завей
ціхенька шэпчуць у вушы. —
Рушыць за ім ці не рушыць?»
«Не, галубочкі, не птушка,
рушце, ды толькі пазней».

«А матылёчак — ці птушка?..»
...Стомлена спіць небасхіл...
...Як мне пакуты адужаць?
Як мне сказаць, не міргнуўшы:
«Не, матылёчак — не птушка,
покі так мала пажыў.
...Покі так мала пажыў».

*Мінск*



## Наталля СМЕРЦАВА

### ТРЫПЦІХ

***1.***

Героям пакланяюся заўсёды,
хоць я да іх не маю дачынення.
Не для мяне ваенныя нягоды
з іх перамогамі і паражэннямі...

***2.***

Грымотны сорак першы —
агонь і дым...
Складаць баюся вершы
аб часе тым.

Ваенную навалу
змаглі спыніць...
І думалі памалу
любіць і жыць.

Нічога больш не трэба —
каб толькі ў нас

было б удосталь хлеба
на доўгі час...

*3.*

Я не лблю кудлатых чорных хмар,
мілей за іх мне — лёгкія аблокі.
Я — не салдатка... Я — жыццяпясняр.
І не з вайны мае вытокі.

*г.п. Друя,*
*Віцебская вобл.*



**Ольга СПИРЯГИНА**

## ДЫХАНИЕ ВОЛН

***Миниатюра***

Море дышит спокойствием, теплые волны ласкают песчаный берег. Солнце уже не такое яркое, не жжет, как днем. Чем ниже спускается светило, тем больше сгущается какая-то сероватая дымка вокраг него. Море спокойно дышит — ждет, когда же раскаленный диск захлебнется в его глубинах...

У горизонта играют, выпрыгивая из воды, дельфины — живая тайна моря. Их жалобные крики летят через водный простор и затихают где-то далеко-далеко.

Волны по-прежнему мерно накатыаются на берег и исчезают.

Накатываются и исчезают...

Рыбаки, живущие у моря, говорят, что каждая волна перед тем, как умереть, оставляет свою песнь в какой-нибудь ракушке. И вот ее уже нет, а песня живет, и завези

ты ракушку хоть в пустыню, на край света, все равно в ней будет слышен голос поющей волны. Он сплетается со вздохами моря, с возгласами угасающего дня, с криками дельфинов... И весь этот вдохновенный венок звуков в свете утопающего в море солнца представляет собой нечто фантастически таинственное и прекрасное.

*Минск*

## Дзяніс СТАРАВОЙТАЎ-ЮРЧАНКА

### ЛАСТАЎКА

***Абразок***

Жыла ў нашай вёсцы дзяўчынка Алёнка, якая зналася з чысцінёй і добразычлівасцю. І была ў яе сяброўка Яніна. Калі Алёнка на момант стамлялася ад працы, зараз жа з‘яўлялася Яніна, каб пагуляць.

А па вёсцы чуткі пайшлі, што на беразе ракі, дзе спрадвеку насыпаны курган, ластаўка змерзла. Кажуць, нават бачылі здалёк, а падысці не адважыліся. Нялёгка падступіцца да ластаўкі. Яніна паспрабавала, дык такога снегу набралася, што пасля некалькі тыдняў з хаты не выходзіла. «Кінь дурное!» — казала Яніна сяброўцы.

Алёнка не згадзілася, яна ведала — людзі верылі, што ластаўка вясну нясе. Хто цяпер паклікае, калі птушаня загіне. Выратавала і ўзяла дамоў. Лекар яна была старанны і цярплівы...

І сталася так, што акрыяла ластаўка, недарэмная была праца. З Аленчыных рук узнялася птушка ў паветра.

«Хоць і не ўсе людзі добрыя на зямлі, але нельга крыўдзіць добрасумленных, — думае ластаўка. — Па-



куль на свеце ёсць добрыя, датуль будзе прыходзіць вясна!» Бліснула маланка, загрукатаў гром. І толькі ён пакаціўся па небе — прачнулася зямля. Шчыра заззяла сонейка .

*Полацк*

## Андрэй **ТАКІНДАНГ**

* * *

Чым зорцы першай пакланіцца,
чым ёй, як Богу, памаліцца,
падумаць раю перад тым:
ці выбар правільны зрабіў—
мо нізка галаву схіліў
ты перад ідалам чужым?

* * *

Што такое чалавек без дарогі да неба?
Тое самае, што дзіця,
для якога не раскрылася ўлонне маці.

* * *

Вось ён ідзе па звычайнай зямлі,
ногі ў бруд апускае.
Той, хто хацеў знайсці дабрыню,
хай яе тут пашукае.

Вось ён ідзе, крыж свой нясе,
сілы з крывёю губляе,
шумны натоўп, дзікі натоўп
Бога свайго зневажае.

Вось ён ідзе, скуру на лбе
церне шматкамі зрывае.
Гэта за ўсіх, добрых і злых,
доля Господня такая.

* * *

Як у бясконцасці васьмёркі,
цякуць у светлым небе зоркі.
Ад іх ружовага святла
амаль нічога ўжо няма.
Агонь свой сонцу аддаюць
і быццам льдзінкі растаюць.

* * *

Жыхар я тутэйшы гэтага краю.
Сюды мяне лёс ланцугом перагнаў.
Упёршыся дзідай у спіну сцяжыны,
пабег бы адчайна ад гэтых мясцінаў.
Ды збітыя ногі —
драўляным прыкладам
наканавання...

* * *

Люблю такую цішыню,
калі чуваць, як сэрца б‘ецца,
як рэха ў ночы зварухнецца,
як дождж у вокнах сумна льецца,

гамоняць травы між сабой,
і вецер шэпча, уздыхае, —
такое толькі ў ноч бывае,
калі пачуеш цішыню.

* * *

Жыццё — прыступка ці адрэзак,
які давядзецца пражыць толькі раз?
А можа, усё ж такі дарога да вечнасці?
Ці шлях да вечнага забыцця?
Дык чаму тады гэты адрэзак існуе,
калі пасля яго нічога не будзе?
А можа, усё ж такі прыступка?

* * *

Калі пойдзеш на той свет,
зайдзі развітацца;
не змагу я без цябе
тут адзін застацца.

Калі будзеш сорак дзён
ты блукаць усюды,
загляні ты да мяне,
наймілейшы дружа.

Калі цяжкія грахі
не дадуць узняцца,
ты скажы, я памалюся
за цябе, мой браце.

Калі ж Бог вялікі дасць
ласку на тым свеце,
раскажы яму пра нас,

як нам тут жывецца.
Толькі ж я цябе прашу:
не маўчы, адкрыйся.
Толькі ж я цябе прашу:
ціхом не журыся.

* * *

Крыкнуць аднойчы, раскінуўшы рукі,
крыкнуць аднойчы на поўныя грудзі,
крыкнуць праз цемру, крыкнуць да сонца,
крыкнуць праз сілу, да жорсткасці моцна,
крыкнуць, каб крыкам тым глотку раздзерла,
крыкнуць, каб нешта ў душы забалела...

## МАЦІ

Маці! Дрыгва паглынае думкі высокія,
прага жыцця крылле аб цвёрдую глебу б‘е.
Маці! Паглянь, ты ляціш не адна, —
колькі вас, птушак высокага неба,
колькі з табой на адной вышыні.
Маці! З табой беларускі-буслі́хі,
крылле ў іх перабіта,
але край наш нясуць да бясконцага неба,
цягнуць на спінах сваіх.
Толькі за кожны рывок да нябёсаў
мусяць даніну крывёю плаціць.
Маці! І ты сярод іх, хоць баліць, ды ляціш.

*Мінск*

## Наталья ТОМАШЕВИЧ

* * *

Мой Лермонтов, в огне или в снегу,
здесь или там, — всегда тебя узнаю:
на лбу ночует тучка золотая,
и тонкая печоринка у губ.

Ты гонишься вслед самому себе,
но лошадь падает среди дороги,
и сердце прыгает на ледяном пороге,
но равнодушна ночь к твоей судьбе.

Она в жаровне шевелит копьем,
огни меняются, блестит дорожный кремень...
И что-то говорит звезда звезде в то время,
когда ты и не смотришь на нее.

### КРЕЩЕНИЕ

Глухой зимой восьмидюймовый лед
пересекает тени тополей,
и темя незакрывшееся вод
под вереском теней...
Младенческое темя родника,
чуть видимое в снежной пелене, —
дитя, не окрещенное пока,
но ангел ожидает в стороне.
И крыл его негаснущий шатер
уже готов принять и осенить,

и безымянной вечности озер
сияние изъять из-под ресниц.

## ПАСХА

Как близка Пасха, как она тепла,
как видится душой распечатленной,
пушистой вербой, почкою зеленой
сквозь синеву лампадного стекла.
В двойном кольце из хлеба и огня
плывет корабль маленького храма,
и месяц в тополях, как гость в сенях,
как половинка зеркала без рамы.
С его салазок спрыгнул Гавриил.
крылом рассеял полусумрак серый
у раковины горестной пещеры
и с женщинами тихо говорил.
Как спицы разлетается вода,
и ступицей серебряный священник
вращается в толпе непосвященных,
прощенных, непрощенных, оглашенных,
сюда не попадая и туда.
Как просто разбудить в себе самом
огонь, живущий в тайном винограде!..
Та грань между водою и вином,
легко преодолимая на свадьбе.
Когда веселье льется через край,
как в Кане Галилейской, и неважно,
чем утоляешь радостную жажду,
раз каждому открыт словесный рай.
Земля в тепле плывет, как поплавок,
как белый хлеб, облитый белым воском,
навстречу растворяющимся звездам,
навстречу утру Пасхи, на восток.

*г. Марьина Горка,*
*Минская обл.*

## Ірына УСАВА



* * *

Скіньце путы з нас.
Скіньце цяжар...
Роднай мове нашай —
дайце абшар!
Няхай вольна жыве
птушкай белай...
Сэрцаў нашых абшар
не знямелы.

* * *

Я загадваю жыць —
і ты жывеш.
Я загадваю быць —
і ты існуеш...
У радасных думках
хаваецца шэрань...
Я адкрыла вакенца —
расчыніліся дзверы.

* * *

Стомленыя рукі.
Стомленыя вусны.
Стомленыя вочы...
Стома — ад спакусы.
Спакуслівы голас.
Спакуслівы стан.

Спакуслівы выгляд...
Спакуса — дарунак
розуму і асалоды.
Дарунак неба —
на мне, бы мярэжа.

*Мінск*

**Аксана ШАБЕКА**

## ЖЫВЫ СВЕДКА

***Нарыс***

*Войны! Злачынная справа — вайна выклікае гнеў мой, і слёзы, і боль.*

***Мікола ГУСОЎСКІ***

У прыродзе ўладарыць вясна. Хутка лес убярэцца ў лісце, на лугах зацвітуць рознакаляровыя краскі, на палях закаласіцца добрае жыта. Усюды так хораша, што, здаецца, усё жыццё любавалася б зялёнымі, духмянымі лісточкамі ды кветкамі.

Але так не бывае, каб усё добра было. Калі вакол прыгажосць, а сэрца спявае, дык абавязкова бяда ў дзверы пагрукае, як у той чэрвеньскі ранак 1941 года... Вялікае гора, слёзы і кроў прынесла вайна ў нашыя гарады і вёскі...

У невялічкія Навасёлкі, што ў Чавускім раёне, ваенная бяда найперш завітала ў хату Васількевічаў: Кіры-

ла Фёдаравіч, гаспадар, адразу ж, у першыя дні вайны, трапіў на фронт і дзесьці ў страшэннай віхуры прапаў без звестак. Дома засталіся жонка, Матрона Пахомаўна, і два сыны: старэйшы — Мікола, перайшоў у чацверты клас Галавенчыцкай сямігодкі, і малодшы — Юрка.

Неўзабаве прыйшлі немцы, і наступілі чорныя дні акупацыі...

Дзень 1941 года, на Пакровы, выдаўся хмуры, сонца не паказвалася з самай рніцы, затое дзьмуў халодны вецер. Немцы нахапіліся ў вёску на досвітку, выгналі ўсіх жыхароў на вуліцу і пад канвоем патурылі ў бок Рагачова. Трое сутак палонных трымалі ў вёсцы Азераны, потым усіх накіравалі ў канцлагер «Азарычы», які размяшчаўся ў лесе, са спускам у балота. Фашысты спецыяльна выбралі дрыгвянае месца, каб стварыць больш цяжкасцяў для вязняў і каб іх як мага больш палегла ад сыпнога тыфу...

Узболатак займаў значную частку лагера. Людзі стараліся размясціцца ў лесе, дзе хоць і быў снег, але не было гразі. На балота вязні хадзілі па ваду — брудную карычневую жыжку, каб змачыць вусны трызнячаму ў тыфознай гарачцы дзіцяці, жанчыне ці старому... Колькі там было плачу, галашэнняў ды праклёнаў лютым катам!

А вакол — мерцвякі... Іх сотні. І большасць у тым пекле было дзяцей. У чым іх віна?

— Памёрлых складвалі ў штабялі, што высіліся каля калючага дроту... — успамінае Васількевіч Мікалай Кірылавіч, пажылы ўжо і спрацаваны чалавек, пенсіянер, цяперашні жыхар усё той жа, але ў два разы меншай, вёскі Навасёлкі. — Мы нават хаваліся за тыя штабялі ад сцюдзёнага ветру, і бачылі, як санітары з каманды па збору мёртвых цягнулі і кідалі ў штабель нават паўжывых, якія яшчэ глядзелі, а варушыцца ўжо не маглі... Іншы раз да калючага дроту пад‘язджала

машына. Немцы кідалі цераз агароджу бοханы хлеба. Галодныя і хворыя дзеці гэтак жа, як і дарослыя, душылі адзін аднаго, лезлі ў адчаі на дрот... Памятаю, як адзін мужчына паспеў схапіць тры боханы, а мы не маглі прабіцца наперад, і тады Юрка, мой брат, падскочыў і выбіў з рук мужчыны бохан... Азвярэлыя каты стаялі па другі бок калючага дроту і рагаталі... Аднойчы ўначы нам удалося распаліць вогнішча, да якога міжволі пачалі спаўзацца знясіленыя людзі. Іх сабралася столькі, што вартавыя з вышак адкрылі пацэльны кулямётны агонь...»

З расказа Мікалая Кірылавіча я даведалася, што тэрыторыя канцлагера была густа абнесена калючкай, на якой віселі смяротныя міны. У дзень вызвалення — 19 сакавіка 1944 года — многа вязняў падарвалася на тых мінах, калі была зламана агароджа і ўсе рынуліся насустрач воінам-вызваліцелям...

Прайшло больш за паўстагоддзе з таго часу. Жыве ў вёсцы Навасёлкі добры і шчыры чалавек — жывы сведка і былы вязень фашысцкага канцлагера «Азарычы». Гадуе ўнукаў. Ды іншы раз нахлынуць цяжкія ўспаміны, а з імі — і роспач, і слёзы, і боль...

Мікалай Кірылавіч, як бы цяжка яму не было, нікому яшчэ не пажадаў таго, што некалі перажыў сам.

*в. Вусце,*
*Магілёўская вобл.*



## Ольга ШАВАРДОВА

* * *

Часто я все забывала.
чтобы заново начать.
Чтобы сердце замолчало.
расхотело чтобы ждать.

Знала: это невозможно,
но пыталась вновь и вновь,
и желала я тревожно
возвращения в любовь.

Но туда уж нет возврата...
Нет туда уже пути —
нити порваны когда-то,
и обрывков не найти.

Часто мучили сомненья,
ошибалась часто я,
но не надо возвращенья —
это все не для меня!

Бесконечные тревоги,
бессердечная судьба.
Разошлись пути-дороги
и теперь уж навсегда.

* * *

Как же ты жил, дорогой, это время?
В небе парил и о бездне грустил?

Часто ли скуки тяжелое бремя
крылья крутило — и не было сил?

Время опять нас рассудит жестоко.
Прошлого дым застилает глаза.
Память — огонь, что сжигает до срока,
и закипает разлуки слеза...

В разные жизни два странника вышли,
но не забыть им былого страниц.
Память святая! Ты будто Всевышний,
перед которым мы падаем ниц.

*Минск*



## Пасляслоўе

Геаграфія «вышуку» будучых класікаў аказалася даволі шырокай — юныя творцы, пераважна школьнікі і студэнты, прадстаўлены ад усіх шасці абласцей. Гэта і гараджане, і вяскоўцы. Нехта з іх працуе ў стыхіі беларускай мовы, нехта — у рускай, але ёсць і такія, хто спрабуе сцвердзіць сябе адначасова, так бы мовіць, у дзвюх творчых іпастасях... Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што бадай першымі ўзгайдалі паэтычную ціхаплынь, выклікаўшы стромыя хвалі ў душах маладых аматараў пяра, менавіта камітэт па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама і мясцовая філія Саюза пісьменнікаў Беларусі. Думаецца, берасцейцам і надалей быць у авангардзе гэтага адказнага мерапрыемства. У іх там і салаўёў стае, і паэтаў не менш за салаўёў, дый начальства, як відаць, даступна-памяркоўнае...

Маладыя таленты — заўсёды і спадзеўка на плён, і будучыня нацыянальнай літаратуры. Іх чуллівыя сэрцы акумулююць энергію дабрыні, шчырасць і высакароднае пачуццё любові да сваёй Айчыны. Яны не зашорана глядзяць на свет, паглыблена-востра адчуваюць час. І галоўнае — кожны прадстаўлены ў гэтым выданні аўтар ужо на самым пачатку імкнецца вытрымаць паўсядзённа-напружаны рытм творчай працы.

Толькі дбайных руплíўцаў мастацкага слова — як у прозе, так і ў паэзіі — чакае Яго Вялікасць Поспех.

Укладальнік і рэдактар выдання
***Алесь МАСАРЭНКА***

# Змест

***Яна АБРАМОВИЧ*** (СШ № 203, 5 кл., Минск)
*Енот. (Строфа)* ........ *3*
***Ольга АДЯЕВА*** (1982. Лицей № 1, Барановичи.)
**** Полуденный осенний зной... Кто-то. (Стихи.)* ........ *3*
***Алена БАБУРЭВІЧ*** (1978. Слуцк)
**** На ранні... *** Задыхнулася ноч... *** Лістапад... Гарадская акварэль. (Вершы.) Спатканне. (Апавед.)* ........ *5*
***Дзіяна БАЛЫКА*** (1979. БДУ, Мінск)
*Абпаленыя нервы. (Чарнобыльскі эцюд.)* ........ *9*
***Таццяна БАРЫСІК*** (1977. МДУ імя А.Куляшова, Магілёў)
*Небяспечныя злачынцы. Хітры дзед. (Байкі.)* ........ *12*
***Ольга БОЖЕЙКО*** (1982. Гимназия № 5, Минск)
**** Утром... *** Домашняя скука... (Стихи.)* ........ *14*
***Таццяна БОНДАРАВА*** (1975. СШ п. Мозалава, Віцебскі р-н.)
**** Спалучае сучаснасць... Сон. *** Сонца... (Вершы.)* ........ *15*
***Інэса БУДНІК*** (1968. СШ, в. Бывалькі, Лоеўскі р-н.)
*О, гэтыя гусі... (Апавяданне.)* ........ *17*
***Ярына ДАШЫНА*** (1978. БДУ, Брэст.)
**** А Вы разумееце... Радзіма. *** Льецца шэпт... *** Ночкай светлаю... *** Варажыла восень... *** Грукнеш ціхенька... Згадкі дзяцінства. (Вершы.) Ліхтар і Зорачка. (Казка.)* ........ *22*
***Зміцер ДЗЯТКО*** (1981. СШ № 95. Мінск)
*Лабановіч і мы... (Водгук.)* ........ *27*
***Алена ІЛЬЮКЕВІЧ*** (1979. Педкаледж, Мінск)
**** Маўчыць бяроза... Вясновы настрой. *** Гарыць... *** Крык... (Вершы.)* .. *25*
***Іна ДЗІЧКОЎСКАЯ*** (1979. МДЛУ, Мінск)
**** Сум... *** Ва ўсім... (Вершы.)* ........ *27*
***Аляксей ЗАНКЕВІЧ*** (1984. СШ, г.п. Капаткевічы)
**** Роднае слова!.. (Верш.)* ........ *28*
***Алена КАВАЛЕНКА*** (1983. Забалоцкая СШ)
*«Рэкецірчык». (Эсе.)* ........ *28*
***Наталля КАРАВАЦКАЯ*** (1974. Балаёўская СШ)
*Тры жаданні. (З пайднёвай легенды.)* ........ *31*
***Вольга КАРАЧ*** (1979. ВДУ, Віцебск)
*Гульні дарослых. (Эцюд.)* ........ *33*
***Вольга КАРЖАНЕЦ*** (1981. СШ № 7, Слуцк)
** ** Ты... (Верш.)* ........ *35*
***Сяргей КОНАН*** (1973. Гімназія № 7, Жодзіна)
*Сустрэча. (Апавяданне.)* ........ *36*
***Ольга ЛАВРЕНТЬЕВА*** (1982. Гимназия № 5, Минск)
**** Я хотела быть листком... (Стихотворение.)* ........ *38*
***Марыля ЛАГОДЗІЧ*** (1979. Музкаледж, Брэст)
**** Ты чуеш... *** Гітарныя аблокі... *** Я паклічу... *** Ці варта... *** Мае слёзы...* ........ *38*

***Алена ЛАПКО*** (1975. Д/С №29, г.Ліда)
*Воўк. (Апавяданне.)* ..........................................................................................
***Анна ЛЫГИНА*** (1979. Жлобин)
*Голодовка. (Фельетон.)* .................................................................................... *41*
***Максім МІКУЛІЧ*** (1982. СШ № 1, Асіповічы)
**** Супакой мяне ... (Верш.)* ........................................................................ *44*
***Вікторыя МІСЮЧЭНКА*** (1982. СШ № 19, Мінск)
*Рэкс і Туз. Сябар разумее без слоў... (Апавяданні.)* ............................... *45*
***Наталья МИХАЛЬЧУК*** (1979. МГУ им. А. Кулешова, Могилев)
**** Не вздохнуть... (Стихотворение.)* ......................................................... *50*
***Ірына ПОЎХ*** (1980. Музкаледж, Брэст)
**** Сэрца б'ецца... *** Круціцца... *** Рассыпаў люты... *** Ноч... *** Я выдумала Вас...* ................................................................................................... *51*
***Сяргей ПРЫЛУЦКІ*** (1980. Тэхнікум, Брэст)
**** Імя Тваё... Яно. *** Калі ўжо ты хочаш... (Вершы.) Незваротнае. (Паэма.)* .............................................................................. *53*
***Наталля РАДКЕВІЧ*** (1978. БДУ, Мінск)
*Парог (Навела.)* .................................................................................................. *59*
***Юрый РАДНОЎ*** (1983. СШ № 210, Мінск)
**** На дзівосных і вольных мясцінах... *** Мелодыю ветра ... (Вершы.)* .... *61*
***Алена РЭПЧЫК*** (1984. СШ г.п. Капаткевічы)
Іголка. (Вершаказ.)................................................................................................ *63*
***Алеся СЕРАДА*** (1983. Гімназія № 2, Мінск)
*Па-над шашой. Ружа. Мінскі вечар. Асенняе люстра. Скарбнік. Музыка. Матыліная маці (Вершы.)* ............................................................. *63*
***Наталля СМЕРЦЕВА*** (1982. СШ, г.п. Друя)
*Трыпціх. (Вершы.)* ............................................................................................ *69*
***Ольга СПИРЯГИНА*** (1979. Политехникум, Минск)
*Дыхание волн. (Миниатюра.)* ......................................................................... *70*
***Дзяніс СТАРАВОЙТАЎ-ЮРЧАНКА*** (1983. Полацк)
*Ластаўка (Абразок)* ........................................................................................... *71*
***Андрэй ТАКІНДАНГ*** (1984. Гімназія, Мінск)
**** Чым зорцы... *** Што такое... *** Вось ён ідзе... *** Як у бясконцасці... *** Жыхар я... *** Люблю... *** Жыццё — прыступка... *** Калі пойдзеш... *** Крыкнуць аднойчы... Маці. (Вершы.)* .................. *73*
***Наталья ТОМАШЕВИЧ*** (1969. СШ № 2, г. Марьина Горка)
**** Мой Лермонтов... Крещение. Пасха. (Стихи.)* ................................. *77*
***Ірына УСАВА*** (1981. СШ №127, Мінск)
**** Скіньце путы... *** Я загадваю жыць... *** Стомленыя рукі... (Вершы.)* ....... *79*
***Аксана ШАБЕКА*** (1983. Вусцянская БШ)
*Жывы сведка. (Нарыс.)* .................................................................................... *80*
***Ольга ШАВАРДОВА*** (1980. СШ № 19, Минск)
**** Часто я все забывала... *** Как же... (Стихи.)* ..................................... *83*

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Высокае неба**
Альманах. Паэзія, проза
На беларускай і рускай мовах

Укладальнік *Алесь Масарэнка*

Адказны за выпуск *А. Малішэўская*